Аўташколы рыхтуюцца — мінтранс распрацаваў комплекс захадаў па ўдасканаленні сістэмы падрыхтоўкі вадзіцеляў аўтамабіляў. Неабходнасць гэтага кроку відавочная.

СТАР. 3

Паездкі ў блізкае замежжа па пакупкі — звычайная рэч для грамадзян многіх краін. Беларусы — не выключэнне. Аб тым, што гэта на самой справе — шопінг у Польшчу — мы распыталі нашага земляка.

СТАР. 3

Дызайнер, якому ўжо за 60, з лёгкасцю эпацыруе публіку, апранае старажытнагрэчаскага Давіда ў касцюм супермена і збірае натоўп 20-гадовых фанатаў і фанатак.

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 ЛЮТАГА 2013 г. СУБОТА № 26 (27391) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

БЕЗ МАДЭРНІЗАЦЫІ НЕ ВЫТРЫМАЦЬ КАНКУРЭНЦЫІ

Без мадэрнізацыі арганізацыі патрэбкааперацыі не вытрымаюць канкурэнцыі на рынках. Аб гэтым заявіў Аляксандр Лукашэнка на справаздачным агульным сходзе прадстаўнікоў членаў Белкаапсаюза, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

На мінулым сходзе нарыхтоўчая галіна Белкаапсаюза была падвергнутая крытыцы кіраўніком дзяржавы. Пэўныя зрухі ў рабоце нарыхтоўшчыкаў намеціліся, звярнуў увагу Прэзідэнт. За апошнія дзевяць гадоў аб'ём закупак сельгаспрадукцыі і сыравіны ў насельніцтва ў супастаўных цэнах павялічыўся амаль у 4 разы. Але гэтай лічбай не варта цешыць сябе, гэта нават не палова таго, што павінна быць, звярнуў увагу ён. За 2012 год насельніцтву за рэалізаваную прадукцыю выплачана Br1,2 трлн. Гэта істотны дадатковы прыбытак для насельніцтва, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Аднак відавочна, што спажывецкая кааперацыя недастаткова выкарыстоўвае рэзервы павелічэння закупак ад насельніцтва, — адзначыў ён. — Вы закупляеце ў насельніцтва толькі 10% таварных рэсурсаў бульбы, 2% гародніны, а таксама 30% пладоў і ягад. Што тычыцца дзікаслай прадукцыі, то летась спажывецкая кааперацыя закупіла ўсяго 7,2 тысячы тон. Гэта складае 40% ад агульнага аб'ёму закупак у цэлым па краіне». Доля спажывецкай кааперацыі ў закупках грыбоў складае крыху больш за 4%. А нарыхтоўка і перапрацоўка гэтай прадукцыі пры нармальнай арганізацыі працы з'яўляецца высокарэнтабельным відам дзейнасці, адзначыў кіраўнік дзяржавы. «А чаго вартая сітуацыя з нарыхтоўкай клубніц, якую мы ўжо публічна абмяркоўвалі? Беларуская спажыўкааперацыя ў 2012 годзе нарыхтавала менш за 2 тоны клубніц. І гэта пры тым, што толькі ў адным Дварэцкім сельсавеце Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці валавы збор клубніц летам склаў 2,5 тысячы тон. Гэта азначае, што немалая доля выгаднай прадукцыі ідзе міма вас», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. «Але ж у вас канкурэнтная перавага! Максімальная даступнасць і мабільнасць у сельскай мясцовасці, — адзначыў Прэзідэнт. — Больш за тое, дзяржава прадаставіла ўсе запытаныя вамі прэферэнцыі для максімальнага палягчэння працэсу закупак: спрасцілі працэдуры, дазволілі разлікі наяўнымі грашыма, далі крэдыты. Маючы такія перавагі, вы свядома саступаеце гэты від дзейнасці прыватнікам. Пытанне — чаму?».

Таму абсалютна аб'ектыўная крытыка ў адрас Белкаапсаюза, якой ён увесь час падвяргаўся ў сродках масавай інфармацыі, кантралюючымі органамі за непаваротлівасць у арганізацыі закупак у насельніцтва, адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Падкрэсліваю: задача па забеспячэнні спажывецкай кааперацыяй закупак вырашчанай насельніцтвам прадукцыі застаецца на вельмі жорсткім кантролі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, недастаткова ўвагі надаецца аказанню дапамогі ў развіцці асабістых падсобных гаспадарак, забеспячэнню вяскоўца ўсім неабходным для вядзення гаспадаркі (насенне, інвентар). «Асабістыя падсобныя гаспадаркі — адзін з рэзерваў павелічэння даходаў насельніцтва. Чалавек павінен быць упэўнены, што калі ён вырасціць дзве-тры тоны бульбы, агародніны або садавіны, то гэта ў яго купяць», — адзначыў Прэзідэнт. Спажыўкааперацыі трэба ісці да насельніцтва, дамаўляцца аб вырошчванні, аб аб'ёмах закупак, цане, заключаць дагаворы, прадаваць элітнае насенне, саджанцы, ажыццяўляць авансаванне і іншае і несці за гэта адказнасць, сказаў кіраўнік дзяржавы. «Памятайце, што асноўны рэзерв у гэтай рабоце — ахапіць не толькі буйныя населеныя пункты, але і малыя аддаленыя вёсачкі», — падкрэсліў ён.

Разам з тым мала закупіць, яшчэ неабходна захаваць прадукцыю ў міжсезонны перыяд, прадоўжыў Аляксандр Лукашэнка. «Вы дакладваеце, што ў канцы 2011 года ў Мінску на адным з вашых прадпрыемстваў уведзены новы склад-халадзільнік з ёмістасцю адначасовага захоўвання больш за дзве тысячы тон з рознымі тэмпературнымі рэжымамі. Гэта добра, але такія аб'екты павінны быць у кожнай вобласці. Давайце дамовімся, што да 2015 года яны будуць, я маю на ўвазе спажыўкааперацыю», — сказаў ён. «Неабходна прывесці ў парадак і існуючыя сховішчы. У такім стане, як яны ёсць, захоўваць якасную прадукцыю сёння недапушчальна!» — падкрэсліў Прэзідэнт.

Таксама Аляксандр Лукашэнка закрануў пытанне павышэння эфектыўнасці работы ў зверагадоўчай галіне. Яно павінна знаходзіцца на асаблівым кантролі. «Станоўчая дынаміка ў развіцці зверагадоўлі, вядома, ёсць. Але не варта забываць, што ў бліжэйшыя гады вы павінны завяршыць усе неабходныя мерапрыемствы па мадэрнізацыі матэрыяльна-тэхнічнай базы зверагаспадарак. Забяспечыць максімальныя аб'ёмы вытворчасці скурак клеткавых пушных звяроў высокай якасці і пашыву гатовых вырабаў з футра для рэалізацыі на ўнутраным рынку і на экспарт», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён канстатаваў, што ў вырашэнні гэтай праблемы няма комплекснага падыходу: «Да гэтага часу Мінсельгасхарч не арганізаваў вытворчасць мясных кармоў для забеспячэння зверагаспадарак краіны — працягваем купляць па імпарце. Канцэрн» Беллегпрам «не стварыў сучасныя магутнасці па пашыве вырабаў з футра». Прэзідэнт даручыў стварыць неабходныя магутнасці і ў гэтым годзе вырашыць гэтую праблему.

СТАР. 2

АГОНЬ ЦАРКОЎНАЙ СВЕЧКІ...

У вёсцы Лысая Гара, што ў трыццаці кіламетрах ад Мінска, круглымі суткамі вырабляюць царкоўныя свечкі — сімвал ахвярнасці і нашага малітоўнага прадстаяння перад Богам. Ад простых да алтарных, вянчальных, святочных — работнікі майстэрні Свята-Елісавецінскага манастыра робяць за суткі каля 160 тысяч свечак. Такую вялікую іх колькасць кожны дзень ствараюць фактычна ўручную. Каб кожная нітачка стала свечкай, майстар павінен зрабіць дзясяткі апусканняў у парафін, пры гэтым на пэўны час — каб атрымаць патрэбную таўшчыню.

Свечкі з гэтай майстэрні сагравающь душу вернікам не толькі мінскіх, але і іншых беларускіх храмаў. Таксама іх запальваюць перад абразамі далёка за межамі нашай краіны.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Іван РЫЖКО, начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя:

«Прапанова Міністэрства аховы здароўя аб тым, каб дазволіць недзяржаўным арганізацыям аховы здароўя выдаваць лісткі часовай непрацаздольнасці, абмяркоўваецца зацікаўленымі бакамі. Ідэя новая, перспектыўная. Сітуацыя ўскладняецца тым, што камерцыйныя клінікі не маюць магчымасці пастаяннага назірання хворага, бо пацыенты прыходзяць туды нерэгулярна і часта ў медустанове няма звестак пра гісторыю іх хвароб. Таксама на стадыі абмеркавання знаходзіцца і пытанне аб праве наймальніка даць свайму супрацоўніку троядзённае вызваленне ад працы ў выпадку хваробы ў эпідэмічны перыяд без афармлення бальнічнага лісткa».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.02.2013 г.

Долар ЗША	8650,00	▼
Еўра	11580,00	▼
Рас. руб.	287,00	▼
Укр. грыўня	1065,11	■

■ У цэнтры ўвагі

СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЕРАЦЫЯ ПАВІННА СТАЦЬ АПІРЫШЧАМ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ НА ВЁСЦЫ

З такім заклікам выступіў кіраўнік дзяржавы на агульным сходзе прадстаўнікоў членаў Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў

Спажывецкая кааперацыя нарадзілася на тэрыторыі Беларусі больш за 100 гадоў таму, яна значна старэйшая і за беларускую дзяржаву, і за Савецкую ўладу. Узнікла як добраахвотнае аб'яднанне грамадзян з мэтай супрацьстаяць манаполіі прыватнага гандлёвага капіталу.

Сёння спіраль гісторыі вярнула спажыўкааперацыю да яе першапачатковых задач — забяспечыць усімі неабходнымі паслугамі малыя населеныя пункты, якія аказваюцца нецікавымі ўладальнікам буйных гандлёвых крам у гарадах. Аднак справіцца з такой задачай спажыўкааперацыя зможа, толькі калі сама будзе цвёрда стаяць на нагах, гэта значыць, мець дастатковыя абаротныя сродкі. Пра выкарыстаныя і ўпушчаныя магчымасці для нарошчвання гэтых сродкаў, а таксама пра пошук новых падыходаў у рабоце спажыўкааперацыі ішла размова на агульным сходзе прадстаўнікоў членаў Белкаапсаюза, які з'яўляецца вышэйшым органам яго кіравання.

— Адным з галоўных прыярытэтаў у працы Белкаапсаюза з'яўляецца поўнае засваенне лішкаў сельскагаспадарчай і дзікаслай прадукцыі насельніцтва, стымуляванне развіцця асабістых падсобных гаспадарак грамадзян, — падкрэсліў у сваім справаздачным дакладзе **старшыня праўлення Белкаапсаюза Сяргей СІДЗЬКО**. — За 2012 год насельніцтву за здадзеную прадукцыю выплачана Br1 трлн 204 млрд, ці ў сярэднім Br530 тыс. на 1 сельскага жыхара рэспублікі.

Многа гэта ці мала? Кіраўніцтва Белспажыўсаюза прызнаецца, што гэта някепска, але недастаткова. Можна было б значна больш. І абяцае да канца 2015 года аб'ёмы нарыхтовак у насельніцтва павялічыць ў 1,5 раза. Шляхоў некалькі. Першы — пераход на дагаворную форму вытворчасці прадукцыі ў асабістых гаспадарках грамадзян. Другі — стымуляванне вытворчасці высакаякаснай сельскагаспадарчай прадукцыі ў асабістых гаспадарках за кошт продажу, таварнага крэдытавання насельніцтва элітным насеннем, саджанцамі, бульбай, а таксама мінеральнымі ўгнаеннямі і сродкамі абароны раслін, сельгастэхнікай. Трэці — стварэнне максімальнай зручнасці насельніцтву для здачы лішкаў сельскагаспадарчай і дзікаслай прадукцыі за кошт прыцягнення да гэтай працы ў сезон не меней за 1,5 тыс. пазаштатных раз'язных нарыхтоўшчыкаў.

Таксама будзе прадоўжана мадэрнізацыя скотазабойных пунктаў. Акрамя таго, прадугледжана развіццё сістэмы збыту, цэнтралізацыя функцый адгрузкі, у тым ліку на экспарт, закупленай сялгас- і дзікаслай прадукцыі, выкарыстанне лагістычнай сістэмы гандлёвай сеткі для яе захоўвання і транспартавання.

СТАР. 2

«ДЗЯРЖАЎНЫЯ СМІ ДАМІНУЮЦЬ У ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСІ»

Аб гэтым журналістам паведаміў міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі перад калегіяй ведамства па выніках 2012 года, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Алег Праляскоўскі адзначыў, што разавыя тыражы рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ — 800 тыс. і 900 тыс. адпаведна — застаюцца на ранейшым узроўні на працягу некалькіх гадоў, але і не растуць. «З гэтым звязана тое, што мы пайшлі ў інтэрнэт. Не хачу глыбока смуткаваць, гаварыць, што мы прайграем «пятай калоне» інтэрнэт. Гэта няпраўда, усе нашы СМІ тут прадстаўлены. Больш таго, кожная раённая газета мае свой сайт», — падкрэсліў міністр.

«Цяпер мы робім вялікі партал СМІ ў Беларусі, які будзе служыць пунктам выхаду на сайт любой газеты, любога канала», — паведаміў Алег Праляскоўскі.

Міністр інфармацыі падкрэсліў, што дзяржаўныя СМІ, як друкаваныя, так і электронныя, утрымліваюць лідарства ў рэйтынгах, а значыць, дамінуюць у інфармацыйнай прасторы Беларусі.

На базе грамадска-палітычнага выдавецкага дома, які ствараецца ў Беларусі на аснове чатырох рэспубліканскіх газет, з часам могуць быць створаны радыё, інфармацыйнае агенцтва, online тэлебачанне, заявіў міністр.

Акупнасць рэгіянальнай дзяржаўнай прэсы Беларусі склала каля 95 працэнтаў у 2012 годзе, паведаміў намеснік міністра інфармацыі Уладзімір Матусевіч.

Намеснік міністра інфармацыі адзначыў, што эканамічнае становішча рэдакцый рэгіянальнай прэсы ў 2012 годзе палепшылася. З прыбыткам спрацавалі 44 рэдакцыі. Для параўнання: у 2011 годзе такіх было 29.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МІНІСТР ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ЛІТВЫ ПАПРАСІЎ ПРАБАЧЭННЯ ПЕРАД ПОЛЬСКІМ НАРОДАМ

У інтэрв'ю польскай газеце Rzecpospolita кіраўнік літоўскага знешнепалітычнага ведамства Лінас Лінкявічус папрасіў прабачэння перад польскім народам за тое, што падчас візіту ў Літву ў 2010 годзе прэзідэнта Польшчы Леха Качыньскага, які пазней трагічна загінуў, літоўскія палітыкі не ўхвалілі напісанне польскіх прозвішчаў на мове арыгіналу. Візіт Лінаса Лінкявічуса ў Польшчу, дзе ён сустрэўся з міністрам замежных спраў Польшчы Радаславам Сікорскім, палітолагі Літвы ўжо называюць паваротным у адносінах Літвы і Польшчы. Сам Лінкявічус заявіў, што двухбаковы дыялог паміж дзвюма краінамі вяртаецца ў нармальнае рэчышча. Літоўскі міністр паведаміў свайму польскаму калегу, што ва ўрадзе Літвы сфарміравана рабочая група, якая будзе вывучаць магчымасці ўнясення паправак у законы, якія тычацца нацыянальных меншасцяў, — гэта самае балючае пытанне ў стасунках паміж краінамі апошні час. Праўда, як адзначыў літоўскі міністр, гарантый таго, што законы будуць зменены, у яго няма.

УРАД ФРАНЦЫІ МОЖА НАЦЫЯНАЛІЗАВАЦЬ АЎТАКАНЦЭРН PEUGEOT

Урад Францыі можа часткова нацыяналізаваць аўтаканцэрн PSA Peugeot Citroen, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на заяву міністра бюджэту Францыі Жэрома Каюзака ў інтэрв'ю мясцоваму тэлеканалу. Паводле яго слоў, такое развіццё падзей не выключана з-за зніжэння аб'ёму продажаў на фоне слабасці еўрапейскага аўтарынку. Аднак улады Францыі прыкладуць усе намаганні для таго, каб кампанія не знікла і засталася на плыву. Па звестках французскіх СМІ, набыццё часткі акцый найбуйнейшага ў Еўропе аўтаканцэрна разглядаецца як крайняя мера ў выпадку неабходнасці павелічэння яго ўласнага капіталу. У Міністэрстве фінансаў Францыі, у сваю чаргу, адзначылі, што зараз пытанне аб частковай нацыяналізацыі кампаніі не абмяркоўваецца. Прыярытэтным жа для самой кампаніі, на думку ўрада, з'яўляецца распрацоўка і дакладнае выкананне плана аднаўлення бізнэсу, а таксама альянс з амерыканскай General Motors. Страты аўтаканцэрна па выніках 2012 года могуць скласці да 6 млрд еўра. Публікацыя фінансавай справаздачы прызначана на 13 лютага 2013 года.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЕЎРАСАЮЗ У 2012 ГОДЗЕ АПЫНУЎСЯ НЕПЛАЦЕЖАЗДОЛЬНЫМ

Пра гэта заявіў кіраўнік Еўрапарламента Марцін Шульц на прэс-канферэнцыі саміту ЕС.

«Яшчэ ў лістападзе мне патэлефанаваў еўракамісар па фінансавым планаванні і бюджэце Януш Левандоўскі, каб паведаміць, што нам не хапае сродкаў на нашы праграмы на лістапад і снежань. З неабходных 9 млрд еўра ўдалося адшукаць толькі 6, — сказаў Шульц. — У бюджэце гэтага фінансавага года ўжо ёсць дэфіцыт у 16 млрд еўра».

«Гэта азначае, што ЕС ужо аказаўся неплацёжаздольным, і Еўрапарламент не можа дапусціць, каб у будучыні дэфіцыт бюджэту структурна нарошчваць», — працягнуў старшыня ЕП.

Гаворачы пра наступствы магчымага правалу перамоў на саміце аб наступным сямігадовым плане галоўнага фінансавага дакумента ЕС, Шульц адзначыў, што ў гэтым выпадку бюджэты супольнасці будуць прымацца на штогадовай аснове на базе палажэнняў 2013 года.

КАРАТКА

У Беларусі паступленні ў мясцовыя бюджэты ад продажу зямельных участкаў на аўкцыёнах у 2012 годзе ўзраслі на 42% у параўнанні з 2011 годам і склалі Br176 млрд. За год рэалізавана на аўкцыёнах 2214 зямельных участкаў. Пры гэтым прададзена ў прыватную ўласнасць грамадзян для індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва 1640 участкаў, для заключэння дагавораў арэнды — 574 участкі.

У Віцебскай вобласці з-за ўздыму захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі часова прыпынены заняткі ў сярэдняй школе № 22 г.п. Балбасава (Орша) і полацкай гімназіі № 1.

Прэм'ера першага беларускага паўнаметражнага анімацыйнага фільма «Прыгоды Несцеркі» рэжысёра Ігара Воўчака адбудзецца ў сакавіку. Гэта смешныя і займальныя гісторыі, у якіх папулярны герой народных легендаў і паданняў Несцерка са сваімі неразлучнымі сябрамі — сабакам і катом — знаходзіць выйсце з любой сітуацыі.

28-гадовы грамадзянін Расіі ў вагоне цягніка Валгаград — Брэст скраў у 36-гадовай жыхаркі Брэста кашалёк, а затым, спрабуючы ўцячы ад пакарання, на поўным ходу выскачыў з цягніка. Пры падзенні зламыснік страціў прытомнасць, атрымаў сур'ёзныя ўдары і зламаў нагу. У кашальку знаходзілася Br55 тыс. і 1 тыс. расійскіх рублёў.

ЧЫМ ПАРАДУЕЦЕ БЛІЗКІХ НА 23 ЛЮТАГА і 8 САКАВІКА? І ЯКІ ПАДАРУНАК НАЙЛЕПШЫ ДЛЯ ВАС?

Мікалай КАРАЧУН, дырэктар ААТ «ГУМ»:

— Што тычыцца падарункаў унукам, то яны залежаць ад таго, хто чым захапляецца. Адзін унук займаецца хакеем, другі — барацьбой, абое сядзяць «у камп'ютарах». Таму ім можна дарыць усё, што звязана са спортам, сучаснымі планшэтамі, развіваючыя гульні. Унучку, якой 3 гады, вядома, радую цацкамі. Дзецям, якія ўжо дарослыя, нявесткам, жонцы і сябрам, калі не ведаю дакладна, што яны хочуць, дару ГУМаўскія падарачныя сертыфікаты на пэўную суму. І яны задаволеныя, бо самі могуць выбраць падарунак на свой густ. Асабліва калі гэта тычыцца парфумерыі, касметыкі, бо ў кожнага чалавека свае перавагі ў пахах, свой тып скуры. Асабіста я рады любому падарунку. За многія гады ўжо шмат чаго перадорана. Цяпер усе каштоўнасці па-іншаму ўспрымаюцца. Мне ў асноўным дораць кнігі.

Іна ЯРЧАК, спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы Мядзельскага райвыканкама:

— Вельмі падабаецца, калі муж разам з сынам арганізоўваюць для мяне нейкі сюрпрыз. Няма абсалютна ніякай розніцы, што яны мне падораць — дарагое ўпрыгожанне, паштоўку ці нешта, зробленае сваімі рукамі. Важна не што, а як. Мне прыемны не столькі падарунак, колькі той факт, што муж прывівае сыну навыкі, як трэба праяўляць увагу да жанчыны, да маці. Заўсёды прыемна, калі раніцай невядома адкуль з'яўляюцца кветкі. Здаецца, ведаеш у сваёй кватэры ўсе закуткі, але не можаш нават здагадацца, дзе муж з сынам іх хавалі. Для мяне важна, як муж ставіцца ў гэты дзень да іншых жанчын. Я вельмі радуюся, калі ён віншуе са святам 8 Сакавіка сваіх каляжанак, бабулю, мяне гэта таксама ўзвышае. Калі гэта падарунак для мужа, то хочацца падарыць тое, што не падараць калегі па працы, нешта больш інтымнае. Калі для сына, то пажадана, каб гэта было нешта такое, што ён хоча, а не тое, што патрэбна.

Сяргей САНЮК, галоўны ветурач УП «Мінскі мясакамбінат»:

— Лепшы падарунак для жанчыны — гэта кветкі, духі, я лічу. А таксама, калі мужчына можа сабе дазволіць, яшчэ і пярсцёнак ці завушніцы, ланцужкі. Трэба, каб жанчына крыху намякнула, што яна хоча (*усміхаецца*), бо самыя дарагія падарункі гэта, зразумела, тыя, якія хочаш атрымаць. А што тычыцца мяне, то мне ўсе падарункі прыемныя, калі яны падораны ад чыстага сэрца. Вольны час, якога няшмат, мы з сябрамі аддаём паляванню ці рыбалцы. Жонка не вельмі вітае гэтыя мае захапленні, але ўжо змірылася. Таму я заўсёды радуюся спецыфічным прэзентам, усяму, што звязана з паляваннем, рыбалкай. Гэта могуць быць і свісткі, і аброжкі сабакам, вабік для гусей ці для качак. У нас з сябрамі ніколі не ўзнікае дылемы, што падарыць адно аднаму.

Надзея ДРЫЛА.

ISSN 1990 - 763X

БЕЗ МАДЭРНІЗАЦЫІ НЕ ВЫТРЫМАЦЬ КАНКУРЭНЦЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў грамадскім харчаванні неабходна зрабіць упор на мадэрнізацыю кандытарскіх вытворчасцяў, укараненне сучасных тэхналогій прыгатавання ежы. Развіваць аб'екты, якія маюць найбольшую папулярнасць у моладзі, якія спецыялізуюцца на стравах беларускай кухні. Улічваючы значнасць дарог Беларусі ў міжнародных зносінах, спажыўкааперацыя разам з іншымі арганізацыямі павінна больш актыўна развіваць паслугі на трасах, ствараючы комплексныя аб'екты прыдарожнага сэрвісу з поўным наборам паслуг — гасцінічныя нумары, харчаванне, ізноў жа з акцэнтам на стравы беларускай кухні.

Аляксандр Лукашэнка патрабуе істотна палепшыць гандлёвае абслугоўванне населеных пунктаў, дзе адсутнічае стацыянарная гандлёвая сетка, а таксама садовых таварыстваў, месцаў масавага адпачынку насельніцтва. «Вяскоўцаў нельга крыўдзіць! Ім неабходна прадаставіць дастатковы выбар запатрабаваных тавараў па прымальных цэнах», — сказаў Прэзідэнт. «У вёсках жыхары гэтак жа, як і ў горадзе, павінны мець магчымасць заказаць неабходныя нехарчовыя тавары, у тым ліку складанабытавыя, а вы абавязаны выконваць гэтыя заказы ў сціснутыя тэрміны і з дастаўкай на дом», — адзначыў Прэзідэнт, звяртаючыся да прысутных. Кіраўнік дзяржавы лічыць неабходным працягнуць набыццё аўталавак, тым больш што на беларускіх прадпрыемствах асвоены іх выпуск. «Прыміце як маё патрабаванне, каб кожны такі населены пункт абслугоўваўся аўталаўкамі не радзей як 3 разы ў тыдзень», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён таксама дадаў, што прадаўцы гэтых магазінаў па заяўках людзей павінны дастаўляць ім тавары на дом, таксама і тым, хто не замацаваны за сацыяльнымі работнікамі. Прэзідэнт падкрэсліў, што кааператыўныя крамы варта зрабіць больш прывабнымі для пакупнікоў як па асартыменце тавараў, разнастайнасці паслуг, так і па культуры абслугоўвання. «Крама на сяле павінна стаць адным з цэнтраў грамадскага жыцця», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на той факт, што па-ранейшаму значная частка тавараварота на сяле складаецца за кошт рэалізацыі хлеба, алкагольных напояў, тытунёвых вырабаў, цукру. У той жа час у структуры тавараварота невысокая доля такіх неабходных нехарчовых тавараў, як адзенне, абутак, складанатэхнічныя тавары, мэбля. «Лічу, што тут службы спажыўкааперацыі істотна недапрацоўваюць», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў пра рашэнне аптымізаваць колькасць дзяржорганаў і скарациць некаторыя з іх. У прыватнасці, прапаноўвалася ліквідаваць Міністэрства гандлю. Аднак Аляксандр Лукашэнка лічыць такі падыход няправільным. «Мы сёння ўзнялі цэлы пласт праблем, якія не вырашаюцца на ўзроўні каардынацыі намаганняў, кантролю, арганізацыі гандлёвых працэсаў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Хто гэтым займаецца? Міхаіл Іванавіч Русы? Дык у яго ва ўрадзе тэматыка ад сельскай гаспадаркі да спажыўкааперацыі. Ён усё гэта не ахопіць. То чаму б Міністэрства гандлю — дзяржаўны орган — не надзяліць гэтымі функцыямі: ад кантролю за цэнаўтварэннем да арганізацыі, каардынацыі, работы асноўных гандлёвых сістэм».

Прэзідэнт лічыць, што скарачэнне Міністэрства гандлю, дзе працуе не так ужо шмат людзей, «надвор'я» не зробіць. Кіраўнік дзяржавы пераканаў, што неабходна ўзмацняць кантроль у сферы гандлю, дзе «сёння поўны разброд і хістанні». «Давайце паглядзім, якімі функцыямі надзяліць Міністэрства гандлю, і галоўнае — гэта кантроль і арганізацыя гандлёвых сістэм (не толькі магазінаў) — прыватных, дзяржаўных, спажыўкааперацыі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЕРАЦЫЯ ПАВІННА СТАЦЬ АПІРЫШЧАМ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ НА ВЁСЦЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пра неабходнасць карэнных змен у існуючай сістэме спажыўкааперацыі сказаў старшыня Мінскага аблвыканкама Барыс Батура. «Маючы самую разгалінаваную гандлёвую сетку ў рэспубліцы і пакуль самую вялікую ўдзельную вагу ў таваразвароце, арганізацыі спажыўкааперацыі валодаюць усімі рычагамі ўздзеяння як на вытворцаў, так і на пастаўшчыкоў, могуць атрымліваць максімальна выгадныя ўмовы пастаўкі, што ў сваю чаргу павінна азначаць наяўнасць прывабных коштаў для спажыўцоў у параўнанні з канкурэнтамі. Аднак мы назіраем сітуацыю, калі кошты на імпартныя тавары вышэй, чым у іншых гандлёвых сетак», — сказаў ён. На думку губернатара, змяніць сітуацыю можа карэкціроўка сістэмы аптовых закупак.

Удзельнікі сходу адзначылі паўнату і актуальнасць выступлення кіраўніка дзяржавы на агульным сходзе, а таксама ўвагу лідара краіны да інтарэсаў простых людзей, якія працуюць у гэтай сістэме.

— Вызначаныя ўсе без выключэння напрамкі, — падзяліўся ўражаннямі **губернатар Віцебскай вобласці Аляксандр КОСІНЕЦ**. — Дакладна былі вызначаны станоўчыя і адмоўныя моманты ў сённяшняй рабоце спажыўкааперацыі. Прэзідэнт адзначыў, што яна з'яўляецца народнай і неабходнай для таго, каб якасна забяспечваць сельскае насельніцтва таварамі. Ён сказаў і пра тое, што кааперацыю трэба развіваць, каб яна была канкурэнтаздольнай з прыватным і дзяржаўным сектарам. Патрэбна дакладная каардынацыя. Я згодны і з тым, што Міністэрства гандлю павінна ўдзельнічаць ва ўзаемадзеянні спажыўкааперацыі з прамысловымі прадпрыемствамі.

— Усе патрабаванні Прэзідэнта цалкам рэальныя, — лічыць **кіроўца-прадавец Петрыкаўскага раённага спажывецкага таварыства Рыгор СОДЗЕЛЬ**. — У дзень я аб'язджаю ад сямі да дзевяці населеных пунктаў. Мы абслугоўваем людзей тры разы на тыдзень, атрымалі новыя машыны на базе «МАЗа», цудоўнае халадзільнае абсталяванне. Таму можам дастаўляць усё неабходнае, свежыя і замарожаныя прадукты. Прыбытак залежыць ад маршруту. Безумоўна, калі вёска далёка і там мала людзей, то такую паездку цяжка акупіць. Аднак мы ўсё роўна ездзім, і людзі заўсёды нешта купляюць. Выйсце — задавальняць любыя патрэбы і прывозіць якасныя тавары. Я нядаўна рэалізаваў халадзільнік, тэлевізар, атрымаў заяўку на веласіпед. Добрая думка і пра тое, каб буйныя крамы ў гарадах дапамагалі нам у забеспячэнні вяскоўцаў разнастайным таварам.

Вельмі слушным акцэнт у выступленні кіраўніка дзяржавы на прапаганду нацыянальных прадуктаў лічыць **майстар-кухар Пастаўскага раённага спажывецкага таварыства Галіна ЗЯМЧОНАК**. «Мы імкнёмся развіваць беларускую кухню ў еўрапейскай падачы, — сказала яна. — Наша прадукцыя вельмі спадабалася на літоўскай выставе. Так што ўсё гэта варта развіваць».

— Важна, што кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на выканаўцаў работы на месцах, паабяцаў і ў будучыні аказваць увагу і дапамогу Белкаапсаюзу, яго арганізацыі, — дадала **інжынер па якасці Пастаўскага раённага спажывецкага таварыства Марына ЦІМЧЫШЫНА**. — Мы абслугоўваем вёскі, дзе пражывае па 20 чалавек, і адначасова адгружаем мяса ў Расію і Казахстан. Два гады таму ўвялі сістэму менеджменту якасці на вытворчасць мяса, а потым распаўсюдзілі яе і на гарачы разліў соку. Наша таварыства можа пахваліцца таксама сваім квашаннем і саленнем, рыбай, замарожанымі прадуктамі. Дзякуючы ўсяму гэтаму маем прыбытак, добрыя заробкі, захавалі ў сваёй структуры будаўнічыя арганізацыі, нарыхтоўчыя, прамысловыя, грамадскае харчаванне і гандаль. На Новы год мы цалкам забяспечылі свой раён, а гэта 20 тысяч насельніцтва, тартамі — зрабілі 6 тон святочнага салодкага пачастунку. Так што, калі аб'яднацца і разам вырашаць агульную задачу, то ўсё атрымаецца.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Сяргей МАСКЕВІЧ:

«АСІЛІЦЬ ПРАГРАМУ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ МОЖА НЕ КОЖНЫ»

У наступным навучальным годзе напаўняльнасць класаў узрасце, вячэрнія школы закрыюцца, а міжшкольныя вучэбна-вытворчыя камбінаты працоўнага навучання і прафесійнай арыентацыі будуць рэарганізаваны. Пра гэта на выніковай калегіі свайго ведамства паведаміў міністр адукацыі нашай краіны Сяргей МАСКЕВІЧ.

ЭКАНАМІЧНАЯ... НЕЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

— Зараз у краіне налічваецца 200 устаноў з напаўняльнасцю да 25 навучэнцаў, з іх 5 размешчаны ў гарадской мясцовасці. На пачатак бягучага навучальнага года ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі былі адкрыты 392 класы з адным навучэнцам. Якая ў гэтым была патрэба? Так, мясцовымі органамі ўлады праводзіцца пэўная работа па аптымізацыі сеткі ўстаноў адукацыі, але ў той жа час суадносіны колькасці настаўнікаў да колькасці навучэнцаў практычна не змяніліся: у бягучым навучальным годзе на аднаго настаўніка прыпадае 8,6 навучэнца, а ў папярэднім навучальным годзе — 8,5.

Міністр адукацыі паставіў перад абласнымі ўпраўленнямі адукацыі і Камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама задачу — з 1 верасня 2013 года сярэдняя напаўняльнасць 1-х, 5-х і 10-х класаў агульнаадукацыйных устаноў, размешчаных у гарадской мясцовасці, павінна складаць 24 навучэнцы. Адкрыццё з 1 верасня 10-х і 11-х класаў з напаўняльнасцю да 5 навучэнцаў не дапускаецца. Як адзначыў міністр, з пункту гледжання эканамічнай эфектыўнасці, сістэма агульнай сярэдняй адукацыі не вытрымлівае ніякай крытыкі.

Дастаткова сур'ёзным з'яўляецца пытанне і аб рэарганізацыі міжшкольных вучэбна-вытворчых камбінатаў працоўнага навучання і прафесійнай арыентацыі. З кола вучняў 10-11-х класаў, якія прайшлі там прафесійнае навучанне, кваліфікацыйны экзамен здаюць не больш за 70% навучэнцаў.

— Фактычна ў дачыненні да 30 працэнтаў навучэнцаў бюджэтныя сродкі былі змарнаваны. Функцыю вучэбна-вытворчых камбінатаў могуць без праблем выконваць і ўстановы прафесійнай адукацыі, — упэўнены Сяргей Маскевіч.

НА ІНТЭРНЭТ-СУВЯЗІ ПЕДАГОГ

Трывогу ў кіраўніка галіны выклікае і выніковасць работы асобных гімназій. Прыкладна ў 28% гімназій конкурсу практычна не было. Пры гэтым амаль 17% гімназій залічылі навучэнцаў з прахадным балам менш як 36, гэта значыць, што будучыя гімназісты мелі менш як 6 балаў па кожным з вучэбных прадметаў.

— Лічу, што ўзровень вучэбных дасягненняў гэтых дзяцей першапачаткова не дазваляе засвойваць ім у гімназіі вучэбны матэрыял на высокім і дастатковым узроўнях. А гэта значыць, што пры фарміраванні кантрольных лічбаў прыёму ў 5-я класы гімназій аддзелы і ўпраўленні адукацыі не аналізуюць сітуацыю і зацвярджаюць лічбы, зыходзячы з пазіцый захавання складу педагагічнага калектыву, а не кіруючыся якасцю адукацыі, — падкрэсліў міністр.

Фота БЕЛТА.

ЛЕПШ МЕНШ, ДЫ ЛЕПШ

Сяргей Маскевіч паведаміў, што ў 2013 годзе будзе здзейснены пераход усіх вышэйшых навучальных устаноў на дыферэнцаваныя тэрміны падрыхтоўкі спецыялістаў. Па прапановах вучэбна-метадычных аб'яднанняў ВНУ, тэрміны навучання будуць скарочаны па 234 з 387 спецыяльнасцяў (62% ад агульнай колькасці).

З 1 верасня 2013 года сярэдняя напаўняльнасць 1-х, 5-х і 10-х класаў агульнаадукацыйных устаноў, размешчаных у гарадской мясцовасці, павінна складаць 24 навучэнцы. Адкрыццё з 1 верасня 10-х і 11-х класаў з напаўняльнасцю да 5 навучэнцаў не дапускаецца.

Яшчэ адна праблема — неабходнасць пераснашчэння вучэбна-лабараторнай базы кабінетаў фізікі, хіміі і біялогіі ў школах. Сяргей Маскевіч паведаміў, што на пераснашчэнне кабінетаў фізікі сёлета будзе выдаткавана 150 млрд рублёў (работа па цэнтралізаванай пастаўцы вучэбнага абсталявання ўжо праведзена), а з 2014-га па 2016 год на аснашчэнне кабінетаў фізікі, хіміі і біялогіі плануецца накіроўваць 475,5 млрд рублёў штогод.

Актуальным напрамкам, на думку міністра, з'яўляецца і выкарыстанне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы:

— Сучасны педагог павінен прыняць новую форму камунікацыйных зносін, знайсці сваю нішу ў сацыяльных сетках і умела ёй карыстацца для ажыццяўлення працэсу выхавання, узаемадзеяння з сям'ёй праз вядзенне форумаў і блогаў, — патлумачыў Сяргей Маскевіч сваю думку.

Кантрольныя лічбы прыёму ў ВНУ будуць скарочаны ў параўнанні з папярэднім годам на 1,7 тысячы бюджэтных месцаў, з іх на дзённую форму навучання — на 800 месцаў. А ў 18 няпрофільных ВНУ не будзе ажыццяўляцца прыём на першы курс па шэрагу эканамічных спецыяльнасцяў. Адначасова са скарачэннем паказчыка агульнага прыёму (як мінімум на 10 працэнтаў) будзе адбывацца і перараэмеркаванне «бюджэтных рэсурсаў» на запатрабаваныя эканомікай высокатэхналагічныя спецыяльнасці.

Як вядома, летась Міністэрствам адукацыі было ўстаноўлена ніжняе значэнне тэставага бала — абітурыенты, якія атрымалі на цэнтралізаваным тэсціраванні менш як 7 балаў, да ўдзелу ў конкурсе не дапускаліся. Сёлета планка прахаднога бала павысіцца: па рускай, беларускай мове, матэматыцы, фізіцы і хіміі — да 15 балаў, а па гуманітарных дысцыплінах — да 20 балаў. Па словах міністра, перш чым агучыць новы прахадны бал, вельмі сур'ёзна аналізаваліся вынікі апошняй прыёмнай кампаніі. У прыватнасці, новыя прахадныя балы «праецыраваліся» на абітурыентаў узору 2012 года:

— Мы спрабавалі пралічыць усе магчымая наступствы. Несумненна, новы парог зменшыць колькасць прэтэндэнтаў на платную форму навучання ў ВНУ. Але навошта залічваць тых, хто ўсё роўна не зможа асіліць праграму вышэйшай школы? Аднак адмовіць у залічэнні зусім слабым абітурыентам ВНУ раней не маглі...

Вельмі важным напрамкам, на думку міністра, з'яўляецца павелічэнне прыёму ў ВНУ спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Сёння падрыхтоўку кадраў па скарочаных тэрмінах ажыццяўляе 21 ВНУ Міністэрства адукацыі...

— Неабходна, каб у 2013 годзе ўсе ВНУ распрацавалі інтэграваныя праграмы і арганізавалі падрыхтоўку спецыялістаў па скарочаных тэрмінах навучання. Інакш многія могуць застацца ўвогуле без студэнтаў, — дадаў міністр.

САМЫЯ «ЗАМОЖНЫЯ» — НА МІНШЧЫНЕ

Агучыў Сяргей Маскевіч таксама і ўзроўні заробкаў у адукацыі. Па звестках статыстыкі за 2012 год, сярэдняя заработная плата склала па адукацыйнай галіне 2 млн 769 тыс. рублёў — гэта 74% ад сярэдняга заробку па краіне, або 332 долары ЗША. Сярэднямесячная заработная плата педработнікаў (акрамя прафесарска-педагагічнага складу) склала летась 3 млн 59 тыс. рублёў, або 81,1%; настаўніка — 3 млн 279 тыс. рублёў, або 87,7% і прафесарска-выкладчыцкага складу — 4 млн 872 тысячы рублёў, або 130,3%.

Для параўнання: сярэдняя заработная плата настаўнікаў у Расіі складае 717 долараў ЗША, у Казахстане — 420 долараў, Германіі — 3900, Фінляндыі — 2600, Францыі — 2200 і Англіі — 2500 долараў.

Самая высокая сярэдняя заработная плата ў педагогаў на Міншчыне — 3 млн 245 тысяч рублёў і ў Магілёўскай вобласці — 3 млн 214 тысяч, а самая нізкая — у Гродзенскай і Брэсцкай абласцях (2 млн 882 тыс. рублёў і 2 млн 943 тыс. рублёў адпаведна).

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Актуальна

АБ ПАВЫШЭННІ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ, АБАРОНЕ ПАЖЫЛЫХ І БЕРАЖЛІВАСЦІ

Учора ў Мінску прайшло пасяджэнне калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі.

— Міністэрства годна выканала свае задачы, у першую чаргу — у галіне сацыяльнай абароны і пенсійнага забеспячэння, — заявіў намеснік прэм'ер-міністра Анатоль ТОЗІК, падводзячы вынікі за мінулы год. — Але сёлета міністэрства павінна звярнуць асаблівую ўвагу на працоўную сферу.

У краіне ёсць праблемы з працоўнымі рэсурсамі. Перш за ўсё, церпіць структура прафесійнай падрыхтоўкі. У выніку назіраецца лішак кадраў з вышэйшай адукацыяй, разадзьмутыя кіраўніцкія апараты, у тым ліку на прадпрыемствах. І адначасова адчуваецца востры дэфіцыт спецыялістаў у будаўніцтве, прамысловасці і іншых галінах.

Існуе і такая праблема, як працоўная эміграцыя. «І яе не вырашыць адміністрацыйнымі метадамі, — лічыць віцэ-прэм'ер. Гэтую праблему трэба вырашаць эканамічнымі метадамі. Безумоўна, трэба павышаць заработную плату, даводзіць яе да ўзроўню суседзяў, каб не было ўцечкі рабочых і спецыялістаў. Але разам з тым неабходна звязваць гэтую заработную плату паслугамі, арыентуючыся на парытэт пакупніцкай здольнасці. Іншага шляху няма. Аднак вырашэнне гэтых пытанняў павінна быць акуратным».

Гаворачы аб павелічэнні рэсурсаў для далейшага развіцця сацыяльнай сферы, Анатоль Тозік адзначыў, што гэта магчыма толькі ў тым выпадку, калі будуць створаны спрыяльныя ўмовы для развіцця эканомікі, для стварэння канкурэнтаздольнай прадукцыі. Яшчэ адным рэсурсам з'яўляецца максімальна рацыянальнае выкарыстанне дзяржаўных сродкаў. «Год беражлівасці павінен быць годам аптымізацыі і руплівага выкарыстання бюджэтных сродкаў», — заявіў віцэ-прэм'ер.

Ён таксама адзначыў такую негатыўную грамадскую з'яву, як сацыяльнае ўтрыманства. «Чалавек сам павінен клапаціцца пра сваё здароўе, пра дабрабыт сям'і. А мы павінны дапамагаць тым, хто ў гэтым сапраўды мае патрэбу — і не на паперы, а рэальна», — сказаў Анатоль Тозік.

Акрамя таго, віцэ-прэм'ер лічыць мэтазгодным распрацоўку новага дэкрэта па аналогіі з дэкрэтам № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у няўдалых сем'ях, які будзе тычыцца абароны пажылых нямоглых сваякоў. «Гаворка павінна ісці не толькі пра платнае ўтрыманне такіх пажылых людзей у дамах-інтэрнатах, а ў цэлым аб дыферэнцыяцыі ў аказанні сацыяльных паслуг. Аказваць сацыяльную падтрымку трэба толькі тым, каму, акрамя дзяржавы, больш дапамагчы няма каму, у каго няма працаздольных сваякоў, абавязаных па законе іх утрымліваць, — сказаў ён. — Калі працаздольны чалавек не хоча падтрымліваць сваіх старых бацькоў, тады трэба яго прымусіць. А не перакладаць гэты абавязак на дзяржаву».

Святлана БУСЬКО

■

ОАО «Брестская трикотажная фирма «Элма»

11 марта 2013 года в 11.00
ПРОВОДИТ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ
по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2012 год и основные направления деятельности общества в 2013 году.
2. Отчет Совета директоров общества.
3. Отчет ревизионной комиссии общества.
4. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности общества за 2012 год.
5. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли общества за 2012 год.
6. Утверждение основных направлений использования чистой прибыли общества в 2013 году и 1 квартале 2014 года.
7. Избрание членов Совета директоров общества.
8. Избрание членов ревизионной комиссии общества.
9. О размере вознаграждения членам Совета директоров и ревизионной комиссии общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13 **с 1 по 7 марта 2013 года с 9.00 до 16.00 либо 11 марта 2013 года** по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания проводится **с 10.30 до 10.50** в день и по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра **на 04 марта 2013 года.**

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Совет директоров общества.

УНП 200295587

ГАРОДНІНА «СА ЗНІЖКАМІ»

Кірмаш-распродаж плодаагародніннай прадукцыі чакаецца ў бліжэйшыя выхадныя — 9 і 10 лютага — у Мінску. Пройдзе ён на сезоннай частцы Камароўскага рынку з 10.00 да 19.00. Што датычыцца коштаў, то цыбулю плануюць прадаваць па 1,55 тысячы рублёў за кілаграм, капусту — па 2,55 тысячы, кіло буракоў будзе каштаваць 1,85 тысячы рублёў, а ліставая салата і гуркі — 2,15 і 38,7 тысячы рублёў адпаведна.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

Дурны гусак

Апошнім часам вядомая айчынная біятланістка Дар'я Домрачава зачасціла ў хронікі скандалаў і чутак. І калі яшчэ нядаўна італьянскі таблоід прысвяціў ёй раман з вядомым лыжным стралком Уле Эйнарам Б'ёрндаленам, сёння інтэрнэт зноў абмяркоўвае чарговую навіну пра Домрачаву.

Аказваецца, што напярэдадні чэмпіянату свету ў чэшскім Новэ-Места наша Даша атруцілася гусяцінай. Таму не дзіўна, што ў змешанай эстафеце наша каманда прыйшла толькі адзінаццатай.

— Гэта было даволі сур'ёзнае атручэнне, — прызналася Дар'я расійскаму парталу sports.ru. — З тэмпературай 39, але доўжылася адзін дзень. Пасля ўсё прайшло. Гэта здарылася на зборы ў Бодэнмайсе (курорт у Баварыі. — **Аўт.**), там досыць своеасаблівая ежа. На вячэру быў гусак, пасля якога... Карацей, вінаваты гусак. Цяпер усё ў парадку, наступстваў я не адчуваю.

Нягледзячы на гэта, інтэрнэт-карыстальнікі адгукнуліся на непрыемны выпадак шматлікімі каментарыямі. Нехта ўзгадвае пра піва, кажа, што *«у тым, як ты страляеш апошнім часам, прабач, ніякі запечаны «гусак» не вінаваты»*, іншыя сцвярджаюць *«цяпер гусь Дашы не таварыш»*, а нехта проста зычыць ёй поспеху. Каб даведацца, чым для беларусаў і Домрачавай скончыцца сёлетні чэмпіянат свету, раім звярнуць увагу на тэлетрансляцыі. Усе старты біятлоннага першынства свету паказвае тэлеканал «Беларусь-2».

Тарас ШЧЫРЫ.

■ Прамая лінія

ТРЭБА ДЭКЛАРАВАЦЬ І НЕПАГАШАНЫЯ ПАЗЫКІ АД ЗАМЕЖНІКАЎ

(Працяг. Пачатак у нумары за 8 лютага.)

На пытанні, звязаныя з аплатай падаходнага падатку і дэкларацыяй даходаў, адказвае намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Святлана ШАЎЧЭНКА.

— Я працую ў парку ў індывідуальнага прадпрымальніка, а яшчэ на палову стаўкі падпрацоўваю прыбіральшчыцай у казіно ў Мінску. У казіно працую афіцыйна і плачу там падаткі. Ці трэба мне падаваць дэкларацыю па выніках года?

Таццяна Малышка, *г. Бараўляны.*

— У вашай сітуацыі казіно, як падатковы агент, пры выплаце даходу ўтрымлівае падаткі. Індывідуальны прадпрымальнік таксама, як падатковы агент, пры выплаце даходу бярэ з вас падаткі. Вам не трэба звяртацца ў падатковую інспекцыю, бо ўсе падаткі вы і так плаціце. Дадатковых падаткаў вам плаціць не трэба.

Паводле інфармацыі на пачатак года, у падатковых органах сталіцы было зарэгістравана 580 індывідуальных прадпрымальнікаў, якія здаюць жыллё на кароткачасовы перыяд («на суткі»).

Такія прадпрымальнікі летась заплацілі ў бюджэт 3,7 млрд рублёў адзінага падатку.

Усяго сёлета ў Мінску па законе здаюць у арэнду іншым фізічным асобам кватэры і нежылыя памяшканні 43 тысячы 946 жыхароў сталіцы.

— Мне казалі, што я магу атрымліваць нейкі падатковы вылік, бо ў мяне ёсць сын. Мой прадпрымальнік параіў звяртацца па падатковы вылік у падатковую інспекцыю...

— Так, тыя бацькі, хто мае дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, маюць права на атрыманне стандартнага падатковага выліку на дзіця. Такія стандартныя падатковыя вылікі даюцца па месцы асноўнай працы. Работа ў прадпрымальніка лічыцца асноўнай, калі ў яго вядзецца працоўная кніжка. Права афарміць такую працоўную кніжку ў індывідуальнага прадпрымальніка ёсць. У гэтым выпадку па месцы асноўнай працы індывідуальны прадпрымальнік абавязаны даць стандартныя падатковыя вылікі свайму работніку. Але, магчыма, у гэтага прадпрымальніка спадарыня Таццяна Малышка працуе па грамадзянска-прававым дагаворы. Тады, калі грамадзянін нідзе не мае асноўнай работы, але атрымліваў на працягу года даходы не па месцы асноўнай работы, напрыклад, у прадпрымальніка па грамадзянска-прававым дагаворы і з-за мяжы, то ён мае права выбару: атрымаць стандартны падатковы вылік у прадпрымальніка ў дачыненні даходаў, што выплачваюцца гэтым прадпрымальнікам, або ў падатковым органе — па даходах з-за мяжы.

Непасрэдна дэкларацыю аб даходах за мінулы год падаюць у падатковы орган асабіста ці праз прадстаўніка. Можа накіроўваць такі дакумент у інспекцыю па пошце і ў электронным выглядзе.

Кар. «Звязды»:
— Якім чынам вяртаецца залішне аплачаны падатак?

— Калі залішне аплачаная сума падатку падлягае вяртанню, то плацельшчык можа звярнуцца ў падатковы орган з пісьмовай заявай. Вяртанне падатку ажыццяўляецца на працягу месяца з дня падачы заявы пры адсутнасці ў плацельшчыка нявыкананых падатковых абавязкаў. Звяртаю ўвагу, што падаць заяву аб вяртанні падатку можна не пазней за 3 гады з даты ўплаты падатку.

Гэта можа быць выдача наяўных грошай праз банкаўскія структуры, налічэнне на пластыкавую картку або паштовым пераводам. Уся працэдура вяртання такіх грошай займае не больш за месяц.

— Чула, што сёлета былі зменены памеры маёмасных і сацыяльных вылікаў. Як істотна яны павялічыліся?

Кацярына Коўш, *г. Мінск.*

— Вас цікавяць менавіта маёмасныя ці стандартныя вылікі?

У падатковую інспекцыю вы можаце падаць дэкларацыю па выніках года, дзе вам прадаставяць маёмасны падатковы вылік толькі па даходах, якія былі атрыманы вамі не па месцы асноўнай працы і па даходах, якія падлягаюць абавязковаму дэклараванню ў падатковым органе па выніках года, напрыклад даходы, атрыманыя з-за мяжы ці за мяжой.

Даведка «Звязды»

Не пазней за 1 сакавіка абавязкова падаць дэкларацыю павінны тыя людзі, якія на працягу 5 гадоў прадалі іншым фізічным асобам другую кватэру ці другі жылы дом (гараж, зямельны ўчастак, садовы домік, дачу ці іншую нерухомую маёмасць). Падаюць дэкларацыю па выніках года і тыя падаткаплацельшчыкі, хто летась прадаў грузавік, аўтобус або іншую легкавую машыну; пасля рэалізацыі каштоўных папер, маёмасных правоў, доляў ці паёў у арганізацыях.

Абавязкова падатковымі рэзідэнтамі нашай краіны (хто знаходзіўся на тэрыторыі РБ больш за 183 дні на працягу года) дэкларуюцца любыя даходы, што былі атрыманы за мяжой і (або) з-за мяжы.

Дэкларацыю свае даходы па выніках года павінны і тыя грамадзяне, у каго ўтрыманне падатку з такіх сум не прадугледжана падатковымі агентамі з ліку арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў.

— Летась я пабудавала кватэру, плаціла шмат уласных грошай...

— Права на атрыманне маёмаснага падатковага выліку маюць асобы, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і ажыццяўляюць расходы на будаўніцтва ці на набыццё кватэры. Калі вы з такіх асоб, то і маеце права на маёмасны вылік. У гэтым выпадку маёмасны вылік даецца на ўсю суму, якую вы патрацілі на будаўніцтва жылля. Нейкіх абмежаванняў па памеры такіх падатковых вылікаў не існуе.

— Як атрымаць гэты вылік? Толькі ў падатковай інспекцыі?

— У вас ёсць асноўная праца?

— Так, ёсць.

— Па месцы асноўнай працы трэба накіраваць пэўны пакет дакументаў, якія пацвярджаюць права на вылік. Гэта, у першую чаргу, даведка аб тым, што вы знаходзіліся на ўліку маючых патрэбу паляпшэння жыллёвых умоў падчас будаўніцтва. Калі ўсе неабходныя дакументы вамі падрыхтаваны, то па месцы асноўнай працы вам абавязаны даць маёмасны вылік. Тады пэўны час у вас будзе льгота па аплаце падаходнага падатку.

— У мяне праца ў камерцыйнай арганізацыі...

— У бухгалтэрыях і камерцыйных арганізацыях добра ведаюць пра такія вылікі. Галоўнае тут — падрыхтаваць увесь неабходны пакет дакументаў, калі на гэты вылік вы маеце права.

— А якія існуюць стандартныя вылікі? У мяне двое дзяцей.

— У 2013 годзе стандартны падатковы вылік на дзіця да 18 гадоў і на кожнага ўтрыманца павялічаны да 155 тысяч рублёў у месяц. Летась такі вылік быў у памеры 123 тысячы рублёў. Для бацькоў, якія маюць дваіх і больш дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, стандартны вылік павялічаны да 310 тысяч рублёў у месяц на кожнае дзіця, (у 2012 годзе было 246 тысяч рублёў).

Сяргей КУРКАЧ.

(Заканчэнне будзе.)

НАВІНЫ

ШЛЯХ ЧЫТАЧА ПАЧЫНАЕЦЦА ПРАЗ КАЗКІ

Дзіцячая паэтка і казачніца Наталля Ігнаценка на XX Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы прэзентавала кнігу «Казачныя падарожжы з прыгодамі».

Для патэнцыяльных маленькіх чытачоў Наталля падрыхтавала адмысловую праграму. Нават правяла міні-віктарыну, дзе самыя ўважлівыя слухачы атрымалі невялічкія прызы — паштоўкі, якія ўласнымі рукамі зрабіла пісьменніца. Акрамя таго, пасля прэзентацыі ўсім дзеткам падарылі падпісаныя аўтарам кніжачкі.

— Казачнае падарожжа складаецца з трох казак, і ўсе яны пра сяброўства, — тлумачыць «Звяздзе» Наталля Ігнаценка. — Усе цяжкасці галоўныя героі пераадольваюць разам. Я спецыяльна пакінула вядомых герояў, якія ўжо існуюць, для таго, каб дзеці не забываліся пра іх. Лічу, што дзеці абавязкова павінны пачынаць свой шлях чытача з казак. Ужо пасля людзі вызначаюцца з выбарам свайго любімага жанру — камусьці па душы фэнтэзі, а камусьці дэтэктывы. Я, напрыклад, і зараз перачытваю Андэрсена.

Надзея БУЖАН, фота аўтара.

З 1 САКАВІКА СПЫНЯЕЦЦА АБАРАЧЭННЕ БАНКНОТ НАМІНАЛАМ 10 І 20 РУБЛЁЎ

Як паведамілі рэдакцыі ў Нацыянальным банку Беларусі, банкноты па 10 і 20 рублёў узору 2000 года будуць прымацца па намінальнай вартасці пры ўсіх відах плацяжоў без абмежаванняў да 28 лютага 2013 года ўключна.

Пасля гэтай даты такія дробныя купюры ў якасці плацежных сродкаў юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі прымацца ўжо не будуць. У перыяд з 1 сакавіка па 30 верасня 2013 года ўключна абмяняць банкноты па 10 і 20 рублёў можна будзе ва ўсіх банках краіны, а з 1 кастрычніка 2013-га па 31 сакавіка 2014 года — толькі ў Нацыянальным банку Беларусі. Паведамляецца, што абмен дробных грошай будзе ажыццяўляцца без абмежаванняў і спагнання камісій у любой суме, кратнай 50 рублям.

Сяргей КУРКАЧ.

МІНІ-САДОК: МАКСІМАЛЬНА ЗРУЧНА

Дзіцячыя міні-садкі, разлічаныя на 24 чалавекі, з'явяцца ў новабудоўлях Гомеля. У краіне гэта адзіны праект, які пачалі рэалізоўваць спецыялісты інстытута «Гомельграмадзянпраект» і Гомельскага домабудаўнічага камбіната.

На правядзенне гэтай работы выдаткаваны грашовыя сродкі з абласнога бюджэту. Зараз ужо распрацаваны і прадстаўлены на разгляд некалькі эскізных варыянтаў дашкольных устаноў. У адпаведнасці з праектамі плануецца размяшчаць міні-садкі на першых паверхах шматкватэрных жылых дамоў, якія будуюцца ў новых мікрараёнах горада. Зразумела, у іх будзе харчовы і медблокі, санвузлы, універсальнае памяшканне для гульняў, спальні і іншае. Паколькі ў Беларусі раней не было падобных праектаў і адпаведнай нарматыўнай базы, спецыялістам прыйшлося вывучыць вопыт расійскіх калег. Намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама Таццяна Атрохава мяркуе, што, калі рэалізацыя праекта апраўдае сябе, вопыт будзе распаўсюджвацца і па іншых гарадах.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПЕРШАЕ ТРАДЫЦЫЙНАЕ БЕЛАРУСКАЕ ВЯСЕЛЛЕ

У ЗАГСе райцэнтра Гарадок, што на Віцебшчыне, упершыню адбылася рэгістрацыя шлюбу з традыцыйным беларускім каларытам.

Фота Ганны НАВУМАВАЙ.

Васіль і Юлія Мартыненкі, вядома, здзівіліся таму, што менавіта іх вяселле ўвойдзе ў гісторыю краю. Іх сустрэлі ў ЗАГСе ў беларускіх народных строях. І астатняе было ўсё, як у часы нашых дзядоў і бабуль: абрадавыя ручнікі, хлеб і соль, квас, спевы... У якасці сувеніра на памяць маладым падарылі званочак. Цяпер тут плануюць зрабіць беларускае вяселле традыцыяй.

А сам Гарадок рыхтуецца стаць сталіцай рэспубліканскага свята пераможцаў жніва «Дажынкі». Ідэя святкавання «Дажынак» у Гарадку належыць старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандру Косінцу. Абласным ведамствам, прадпрыемствам і арганізацыям, аблвыканкаму дадзена заданне зрабіць усё магчымае, каб раённы цэнтр у 2014 годзе, калі задумана прыняць «Дажынкі», стаў прыгожым горадам, з развітай інфраструктурай — тыповай для цэнтра Еўропы.

ЦЫГАРЭТНЫ ДАХ... АЎТОБУСА

Полацкія міліцыянеры ў гаражы 42-гадовага непрацуючага знайшлі 66 тысяч пачкаў цыгарэт айчыннай вытворчасці на суму больш як 323 мільёны рублёў. Паколькі на тытунёвыя вырабы не было дакументаў, якія пацвярджаюць легальнасць іх набыцця, яны канфіскаваны. Праводзіцца праверка.

І ў полацкіх пагранічнікаў багаты тытунёвы ўлоў. Яны сумесна з супрацоўнікамі мытні ўсяго за суткі знайшлі і цыгарэты на даху рэйсавага аўтобуса, які выязджаў у Латвію праз пункт пропуску «Урбаны», а таксама выявілі кантрабанду ў грузавых цягніках — пад пластом вугалю. Канчатковая кропка маршруту ўсяго гэтага транспарту супадала — Даўгаўпілс. Такім чынам, на тэрыторыю суседняй Латвіі невядомыя кантрабандысты планавалі пераправіць больш за 29 каробак цыгарэт, вырабленых у Беларусі. Уся тытунёвая прадукцыя канфіскавана, удакладняецца яе кошт.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАДЗЕІ

АЎТАШКОЛЫ РЫХТУЮЦЦА: СІСТЭМА НАВУЧАННЯ КІРОЎЦАЎ БУДЗЕ ЎДАСКАНАЛЕНА

Мінтранс распрацаваў комплекс захадаў па ўдасканаленні сістэмы падрыхтоўкі вадзіцеляў аўтамабіляў. Неабходнасць гэтага кроку відавочная. Хоць у краіне дзейнічаюць зацверджаныя праграмы падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі вадзіцеляў, у транспартнае ведамства рэгулярна паступаюць звароты з прапановай аб пашырэнні альбо скасаванні некаторых пунктаў. У Мінтрансе запэўніваюць, што пры абгрунтаванасці такіх заўваг будуць уносіцца карэкціроўкі. Напрыклад, абавязкова павінна адбыцца ўнясенне змяненняў, якое тычыцца навучання інвалідаў, з чым сёння ў краіне існуюць пэўныя цяжкасці...

У Беларусі на сёння рыхтуюць і павышаюць кваліфікацыю кіроўцаў механічных транспартных сродкаў 512 навучальных арганізацый. У параўнанні з 2011 годам іх колькасць выросла. У цэлым аўташколы раўнамерна размеркаваны па тэрыторыі рэспублікі і цалкам задавальняюць патрэбы насельніцтва ў адпаведных паслугах, прытым, што ў 2006 годзе яны адсутнічалі ў 14 раёнах краіны. Органамі па сертыфікацыі падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі аўтавадзіцеляў з'яўляюцца «Белтэхагляд» і Беларускі дзяржаўны інстытут метралогіі (БелДІМ). За 2012 год эксперты-аўдытары «Белтэхагляда» правялі больш за 460 сертыфікацыйных праверак аўташкол.

Паводле слоў **начальніка аддзела ўпраўлення інавацый, навукова-тэхнічнай дзейнасці і транспартнай бяспекі Міністэрства транспарту і камунікацый Паўла БРЭЧКО**, да сістэмы падрыхтоўкі будуць прад'яўляцца новыя патрабаванні, якія датычацца прадастаўлення паслуг навучання вадзіцеляў у цэлым, а таксама, у прыватнасці, закрануць падыходы па тэхнічным аснашчэнні аўташкол і правядзенні выніковых іспытаў. Распрацаваны комплекс захадаў прадугледжвае ўнясенне змяненняў у шэраг нарматыўных прававых актаў, якія ўстанаўліваюць гэтыя патрабаванні. Для гэтага створана рабочая група, у якую ўключаны прадстаўнікі аўташкол, грамадскіх аб'яднанняў і асацыяцый, органаў па сертыфікацыі адпаведных паслуг.

Змены не будуць уносіцца спантанна, бо трэба ўлічваць меркаванне тых міністэрстваў і структур, у чыім падпарадкаванні знаходзяцца арганізацыі па навучанні ваджэнню. Дарэчы, найбольшая колькасць аўташкол падведамасная Міністэрству адукацыі (34,9%), ДТСААФ (17,8%), Мінтрансу (6,7%), Мінсельгасхарчу (5,9%); 27,9% аўташкол маюць недзяржаўную форму ўласнасці.

«Быў такі прэцэдэнт: пасля прыняцця рашэння аб паляпшэнні пакрыцця аўтадромаў

Можа быць уведзена адзінае патрабаванне аб аснашчэнні ўсіх вучэбных аўтамабіляў навігацыйным абсталяваннем. Толькі тады тая ці іншая аўташкола атрымае права займацца падрыхтоўкай будучых кіроўцаў.

Мінадукацыі, якое мае вялікую колькасць падведамасных аўташкол, заявіла, што яго ўстановы, якія фінансуюцца з бюджэту, не маюць магчымасці хутка рэалізаваць задуманае, паколькі патрэбныя сродкі варта прадугледжваць загадзя», — расказаў Павел Брэчко. У выніку ў Мінтрансе прыйшлі да высновы, што ўступленне ў дзеянне рашэння аб удасканаленні пакрыцця неабходна аднесці на больш позні тэрмін. Цяпер падобнага роду і іншыя пытанні прадстаўнікі транспартнага ведамства абмяркоўваюць сумесна. «Не будзе рэзкіх змяненняў, скажам, на працягу 20 дзён», — адзначыў прадстаўнік Мінтранса.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Калі гаварыць пра новаўвядзенні, то цяпер разглядаецца пытанне аб ужыванні кантролю за практычным навучаннем ваджэнню з выкарыстаннем сістэм глабальнага пазіцыянавання (GPS). «Трэба будзе вырашыць, хто будзе гэтым займацца і ці аддаваць паўнамоцтвы аўташколам, бо адны стануць кантраляваць працэс, іншыя — не», — выказаў думку Павел Брэчко. Як варыянт, можа быць уведзена адзінае патрабаванне аб аснашчэнні ўсіх вучэбных аўтамабіляў навігацыйным абсталяваннем. Толькі тады тая ці іншая аўташкола атрымае права займацца падрыхтоўкай будучых вадзіцеляў.

Плануецца таксама дэталізаваць кваліфікацыйныя патрабаванні да майстроў вытворчага навучання: хто можа да такіх адносіцца, а таксама як часта гэтыя спецыялісты павінны павышаць сваю кваліфікацыю.

Немалаважнай з'яўляецца экзаменацыйная тэма. Сёння дзейнічае Інструкцыя аб парадку прыёму кваліфікацыйных экзаменаў на права кіравання аўтамабілем у адпаведнасці з пастановай МУС. Аднак з боку Навукова-практычнага цэнтра праблем умацавання законнасці і правапарадку Генеральнай пракуратуры паступалі прапановы аб неабходнасці яе перапрацоўкі. Акрамя таго, мяркуецца разгледзець пытанне аб увядзенні нормаў, якія абмяжоўваюць колькасць спроб здачы практычнай часткі кваліфікацыйнага экзамену. «Каб чалавек не здаваў практыку бясконца, будзе вызначана колькасць спроб, пасля перавышэння якой спатрэбіцца праходжанне дадатковага навучання», — растлумачыў Павел Брэчко. Рабочая група абмяркуе гэтыя тэмы.

Вядома, што аўташколы неаднаразова звярталіся ў Мінтранс з просьбай аб павелічэнні колькасці практычных гадзін кіравання. Прадстаўнікі транспартнага ведамства ў цэлым не пярэчаць, аднак гэтае пытанне замацавана ва ўказе № 551 «Аб мерах па павышэнні бяспекі дарожнага руху», якім зацверджаны Правілы дарожнага руху. Згодна з ім, курсантаў, якія хочуць стаць кіроўцамі аўтамабіляў катэгорыі «В», павінны вучыць не менш чым на працягу трох месяцаў па 220-гадзіннай праграме, якая ўключае 40 гадзін практычнага навучання. Каб павялічыць гэтую норму, трэба ўнесці змены ва ўказ, што зойме нямала часу. Павел Брэчко таксама падкрэсліў, што самі грамадзяне павінны быць знаёмыя з гэтымі правіламі і праяўляць пільнасць. «Абавязкова трэба звяртаць увагу на тое, пад чым вы падпісваецеся: часта людзі ў зваротах пішуць, што практыкаваліся на аўтамабілі, скажам, тройчы, а пры праверцы мы бачым іх подпісы на дакументах, якія сведчаць пра значна большую колькасць гадзін», — заўважыў ён.

Таццяна ІВАНЮК, БЕЛТА.

Лічбы з нагоды

Па звестках Міністэрства транспарту і камунікацый, за 2012 падрыхтавана больш як 179 тысяч вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў розных катэгорый, што на 0,6% больш, чым у папярэднім годзе. З іх 129,3 тыс. чалавек (71,8% ад агульнай колькасці) складаюць кіроўцы катэгорыі «В».

ФАКТЫ

УЗВЯДЗЁМ ХРАМ УСІМ СВЕТАМ

Нехта сказаў, што рукапісы не гараць. Гэта проста словы, не больш. Гарыць усё. Нават храмы.

Месяц таму Беларусь абляцела вестка пра пажар у Хатлянах: згарэў праваслаўны храм. Для жыхароў гэтага населенага пункта здарэнне стала сапраўднай трагедыяй. Па-першае, храм узводзілі майстравыя продкі цяперашніх хатлянцаў. А колькіі пакаленняў тут хрысцілася, спавядалася, брала шлюбы, было адпета! І не толькі жыхароў Уздзеншчыны, але і суседніх раёнаў — Пухавіцкага, Слуцкага, Мінскага, і нават з самога Мінска. Пакроўскі храм быў душою Хатлян, пра што сведчыць яго аднаўленне напрыканцы 1990-х.



Для ўсёй краіны гэта стала вялікай стратай, бо знік выдатны помнік драўлянага дойлідства, а іх, гэткіх залацінак у Беларусі, не так і шмат.

Храм знішчаны полымем дашчэнту. Жудаснае відовішча. Асабліва для тых, хто тут побач жыве, штодня праходзіў каля святыні, маліўся, верыў. Засталіся толькі рэшткі прытвора.

На стале — ружы. Белыя. У зімовай шэрані. Ад тых, хто смуткуе і верыць. У аднаўленне.

Настаяцелю прыхода айцу Віталю Ляшкевічу сёння вельмі патрэбна маральная падтрымка. Пры яго ўдзеле храм ператвараўся з асквернена атэістамі святыні ў сапраўдны цуд дойлідства, красаваў і ўлетку, і ўзімку, быў адчынены для кожнай душы, якая шукала шлях да Бога. І святару звоняць з усіх куточкаў Беларусі, пытаюцца, чым дапамагчы. Гэта ўмацоўвае перакананні святара і многіх прыхаджан у аднаўленні святыні.

— Каго Бог любіць, таго і наказуе, — словамі з Евангелля кажа святар. — Але Гасподзь пасылае нам добрых людзей, гатовых памагаць у аднаўленні, і мы будзем будаваць такі ж, як і быў, храм, на гэтым самым месцы.

А храм стаяў на высокай гары і меў неверагодна прыгожы выгляд. Неаднойчы і мне даводзілася рабіць фотаздымкі для папаўнення калекцыі пра драўляную архітэктурную спадчыну. Цяпер, гледзячы на фота царквы, якая патанае ў вясновай квецені, сціскаецца сэрца ад думкі пра страту святыні.

— Заўсёды храмы будавалі ўсім светам. Як бы цяжка ні было і колькі б гэта ні каштавала, вырашана: храму быць! — перакананна кажа Віталь Ляшкевіч.

Зазірнуўшы ў інтэрнэт, знайшоў паведамленне пра адкрыты рахунак, на які можна пераводзіць грошы. Магчыма, хтосьці з нашых чытачоў таксама хацеў бы далучыцца да гэтай акцыі, таму калектывам рэдакцыі вырашылі надрукаваць рэквізіты: УНП 600336527, р/р 3015062500160 ЦБУ 625 філіял 500, Мінскае ўпраўленне ААТ «ААБ Беларусбанк», г. Узда.

Гарыць усё. Не гарыць толькі вера...

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

У ПОЛЬСКІЯ КРАМЫ ШЛЯХ НЯПРОСТЫ

Паездкі ў блізкае замежжа па пакупкі — звычайная рэч для грамадзян многіх краін. Беларусы — не выключэнне. Аб тым, што гэта на самой справе — шопінг у Польшчу, мы распыталі земляка, які на мінулыя выхадныя з'ездзіў у суседнюю краіну.

Калі няма ўласнай машыны ці жадання стаяць у даўжэзных чэргах, плаціць замежную страхоўку і магчымыя дарожныя штрафы, туды лепш дабірацца аўтобусам. Айчынныя турыстычныя фірмы шчодра прапануюць гэтую паслугу. Шлях да Беластока каштуе недзе ад 35 долараў. Гэта цана дарогі туды-назад і па горадзе — паміж крамамі і кірмашамі.

Зразумела, патрэбна яшчэ мець польскую альбо шэнгенскую візу. Калі іх няма, турфірмы зробяць аднаразовую. Тыя ж 60 еўра заплаціш, ды яшчэ зверху — за клопат.

Збор такіх, як я, турыстаў ад эканомікі прызначылі на Дружнай, каля вакзала. Пятніца, канец працоўнага тыдня. Аўтобусаў сабралася шмат. Відаць, што пасажыры бывалыя, усё ведаюць. Калі аўтобус пачынае рухацца, стараюцца задрамаць. Тэлевізар пад столлю вісіць, але яго не ўключаюць. Чаю-кавы таксама не прапануюць — малабюджэтны маршрут.

Першае сур'ёзнае выпрабаванне — мяжа. Турыстычныя аўтобусы ідуць тут па сваёй асобнай паласе. Але нават калі аўтобус акажацца адзіным, гэта не значыць, што вы праляціце мяжу, як на крылах.

Зайшоў адзін пагранічнік, палічыў людзей, выйшаў, адкрыў шлагбаум. Праехалі трохі наперад. Зайшоў другі, сабраў пашпарты і пайшоў з імі. Назад не прынёс, перадаў праз вадзіцеля.

Далей яшчэ адзін пагранічнік адчыніць шлагбаум на дарогу да Польшчы.

А вось на польскім баку нас наведвае толькі адзін вартавы граніцы. Як на шляху туды, так і на зваротным.

Міжволі ўзнікаюць думкі — ці не лепш было б, асабліва ў наш час прадэкларованай аптымізацыі, каб першы айчынны пагранічнік адразу і пашпарты збіраў? Мо больш плаціць яму, што працуе за другога? А замест трэцяга наогул паставіць аўтаматычны шлагбаум і адчыняць яго дыстанцыйна?

У Беласток прыязджаем недзе пад тры гадзіны ночы па нашым часе. Пункт першы — рынак. Некалькі кіёскаў ужо працуе. Там прапануюцца простыя рэчы. Чай, кава, пральныя парашкі, шакалад, сухафрукты. Цэны сапраўды прымальныя. 200-грамовая нямецкая шакаладка з разынкамі і арэхамі, калі перавесці на нашы грошы, каштуе менш за 15 тысяч рублёў. Паўкілаграмовы пачак кавы вытворчасці Германіі — каля 45 тысяч. Польская — 35. 10-кілаграмовы пачак самага таннага пральнага парашку мясцовай вытворчасці абыдзецца крыху больш за 70 тысяч.

Пры тым, што мясцовая валюта паднялася ў цане, а долар, з якім звычайна прыязджаюць беларусы, патаннеў. Восенню за яго ў абменніку тут давалі 3 злотыя і 25 грошаў. У гэты дзень лютага долар мянялі роўна на тры злотыя. Таму тавары падаражэлі. Гэта, уздыхаючы, прызнаюць мае спадарожнікі. Тая нямецкая шакаладка, як памятаюць яны, наогул каштавала нядаўна 13 тысяч, а парашок — 65.

Касавых аўтаматаў я ў павільёнах не бачу. Але прадавец акуратна піша мне чэк ад рукі. Там дакладна пазначана, што куплена і за колькі. Хоць я яго і не прасіў пра тое.

У 6 гадзін чакае пераезд у наступны магазін — дробнаптовы. Гэты вялізны гіпермаркет якраз пачынае працу. Тут знаўцы раяць набываць сыры, мясныя і рыбныя вырабы, ёгурты. Цана кілаграмовай банкі мясцовага ёгурту — недзе пад 20 тысяч. 500-грамовая, сусветна вядомай маркі, пад 8 тысяч. Незвычайна дарагі ў беларускіх крамах 125-грамовы пачак сыру «Прэзідэнт» абыдзецца ў 12 тысяч. Танныя і парашкі, нейкія прамысловыя рэчы. А вось адзенне каштуе дорага. Нават з прадэкларованымі зніжкамі.

Чым бліжэйшы час адпраўлення аўтобуса, тым больш нервуюцца землякі. Да таго ж некаторыя займаюць чаргу амаль на ўвесь свой аўтобус, што яшчэ болей падагрэе атмасферу. Урэшце хто, нервуючыся, кідае тавар перад касай і бяжыць да аўтобуса, а хто стаіць да канца. Ведае, што ўсе беларускія аўтобусы ідуць далей па адным маршруце і дагнаць сваіх можна з наступнай групай. Чужых бяруць усе без праблем.

На трэцім прыпынку чакае кірмаш. Там у асноўным адзенне і прамысловыя тавары для дому. Тавар не сусветных брэндаў, але і цэны таму ніжэйшыя, таргавацца можна. Пляцоўкі вакол запоўнены аўтамабілямі з беларускімі нумарамі, асабліва гродзенскімі. Усюды чуваць наша гаворка, якую добра ведаюць і прадаўцы.

А вось наступны прыпынак — для многіх асноўны пункт. Там пад адным дахам — гіпермаркет, галерэя буцікоў і буйны магазін радыётэхнікі. Нашы землякі набываюць тэлевізары, тэлефоны, ноўтбукі. Тут самыя велізарныя чэргі на афармленне такс-фры, ці так званых «ватаў». У гэтым і хаваецца асноўная выгада ад польскіх пакупак. Потым з цаны вылічваецца і вяртаецца пакупніку падатак на дабаўленую вартасць. А гэта можа складаць да 25 працэнтаў кошту. Вялізны плазменны тэлевізар за 600 долараў абыдзецца менш за 500. Уся паездка адразу і акупіцца. Такс-фры можна афармляць ад пакупак агульным коштам 200 злотых.

Праўда, на гэты раз тэлевізары ніхто не купляў. Бо не было тых мадэляў, якія ў нас карыстаюцца найбольшым попытам — усе раскупілі.

Гляджу цану ноўтбукаў — амаль тое, што і ў нас праз інтэрнэт прадаецца.

Нашы землякі не засмучаны няўдачай, купляюць адзенне, прадукты, сантэхніку.

А ў буціках якраз пара вясновых зніжак. Гаспадары пачалі распрадаваць зімовы тавар. Ды і на іншыя рэчы ўцэнка здараецца добрая. Бачыў чаргу з мясцовых людзей па касцюмы вядомага брэнда за 300 долараў. Яшчэ на днях такія каштавалі па 700. Прыгожыя модныя кашулі — па 13, а былі па 40.

Пару разоў чую, як дзяўчаты-прадавачкі ціха размаўляюць паміж сабой на нашай мове. Захацелася распытаць зямлячак пра іх мясцовае жыццё, але яны ўраз бянтэжацца... і пераходзяць на польскую.

Перад ад'ездам на радзіму з жахам гляджу на агульную кучу пакупак, што трэба ўціснуць у багажныя адсекі аўтобуса. У суседзяў гара яшчэ большая, і нават салон у іх завалены. Але вадзіцелі не панікуюць. Яны ўпэўнена пакуюць у чэрава старэнькага «Неаплана» ўсю гару. На вуліцы не застаецца нічога.

Пераязджаючы з месца на месца, паспяваеш хоць праз акно палюбавацца мясцовымі краявідамі. Тут шмат храмаў, у тым ліку праваслаўных. Мноства прыгожых новых дамоў. Катэджы і ўласныя дамы нават у вёсках

Толькі ў нас бачыў, як на мяжы пасажыраў прымушаюць выйсці, узяць усе свае рэчы і пакупкі і валачыся з імі ў залу мытні для агляду.

не хаваюць за магутнымі платамі, як гэта бывае ў нас. Максімум — акуратнай сетачкай абгароджваюць.

Недзе ў шэсць вечара аўтобус кранаецца дамоў. Да Мінска чатыры сотні кіламетраў. Але гэта дарога — самая няпростая.

Да мяжы недзе аж за дзесяць кіламетраў працягнулася чарга з вялізных фур. Як там вадзіцелі церпяць, прасоўваючыся на працягу некалькі сутак наперад па метры, можна толькі здагадвацца. Вакол чыстае поле — ні хат, ні крам.

Наш аўтобус бесперашкодна падыходзіць амаль да самага пункта пропуску. Перад намі ўсяго некалькі аўтобусаў. Пакуль чакаем, нас аб'язджае рэйсавы гродзенскі — у іх тут прыярытэт.

Пасажыры прыціхлі. Ведаюць усе магчымыя далейшыя варыянты і спадзяюцца абмінуць самы цяжкі.

Пагранічны кантроль зноў хуткі і беспраблемны.

А далей — горш. Пасажырам, якія аформілі «ваты», трэба паказаць усе рэчы, на якія выпісаны такс-фры, прадстаўнікам польскай мытні. Тут — дзяржаўныя грошы, з якімі не жартуюць. Таму мытнікі аглядаюць і звяраюць літаральна кожную рэч. Калі бачаць блытаніну ў дакументах, альбо папера афармлена неахайна, могуць патэлефанаваць у краму, дзе рабілася пакупка, і ўсё ўдакладніць занава.

Транспарту шмат, а мытнік на гэтай працэдуры ўсяго адзін. І хуткасць справы — адпаведная.

Потым — наша мяжа. Айчынны пагранічны кантроль таксама даволі хуткі. А вось потым...

Я, здаецца, шмат паездзіў па свеце. І на аўтобусах таксама. Але толькі ў нас бачыў, як на мяжы пасажыраў прымушаюць выйсці, узяць усе свае рэчы і пакупкі і валачыся з імі ў залу мытні для агляду. Там твой багаж могуць пераважыць, дэталёва пераварушыць. І на ўсё гэта патрэбен час.

Вось так і цяпер — пад поўнач, па снезе, у мароз далі каманду на выхад.

Мае суседзі кажуць, што так робіцца ў кожнай паездцы. Толькі аднойчы пашанцавала, відаць, добры мытнік трапіўся ці ў настроі быў — прапусціў без выгрузкі.

— А што-небудзь забароненае хоць калі выявілі? — цікаўлюся.

— Ды ні разу нічога.

Асабліва шкада бабулек, якія ўволю пашчыравалі на танным шопінгу. І ў іх проста не хапае рук і сіл цягаць туды-сюды свае клункі. Але ніякіх вазкоў пад перавозку рэчаў, зразумела, мытняй не прапаноўваецца.

Наш кантроль цягнецца доўга і марудна. Малады мытнік толькі заступіў на змену, ён нікуды не спяшаецца. Хлопец, праўда, ветлівы. Узважвае рэчы, просіць адкрыць ці не кожную сумку.

Здзіўлена аглядае мой няхітры скарб. І адпускае, амаль не зачапіўшы. Напэўна, адразу адчувае дылетанта памежнага шопінгу. Хоць сярод сённяшніх пасажыраў няма ніякіх кантрабандыстаў і нават аптовых пакупнікоў. Людзі зрабілі пакупкі для сябе і, магчыма, для сваякоў, сяброў.

Але знайшлі парушальнікаў і ў нашым аўтобусе. Хтосьці вёз недзе з кіло сырога мяса — а яго везці нельга. Яшчэ ў аднаго мужчыны выявілі некалькі лішніх упаковак жаночых калготак.

Недзе пад гадзіну ночы ўсё заканчваецца. Валачом сумкі назад. Кіроўцы цярпліва грузяць іх зноў. На мяжы мы «пражылі» амаль восем гадзін. За гэты час можна было даехаць да Мінска і назад вярнуцца.

Пад ранак прыязджаем на Дружную. Сіл няма амаль ні ў кога — дзве ночы не спаўшы.

— Паедзеце яшчэ ці не? — з усмешкай цікавіцца сусед па аўтобусе.

— Не, больш ні нагой, — адказваю. І сам пакуль веру ў свае словы.

— Усе так спачатку думаюць, — смяецца сусед. — А паходзіце па нашых крамах — і зменіцца думка. Я кожны раз так гарачуся. А езджу ўжо мо гадоў з дзесяць.

Запісаў Віктар ВІКЕНЦЬЕЎ.

БАГАЦЕЕ СВЕТ КНІГ

Шырыцца, зіхаціць новымі фарбамі, багацее чароўны свет кнігі. У гэтыя дні на XX Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы можна пазнаёміцца з мноствам навінак друкаванага слова. Гэтыя фотаздымкі адлюстравалі толькі два імгненні з вялікага выставачнага карагоду. Каля паліц з выданнямі РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» аб'ектыў убачыў сустрэчу з чытачамі журналіста газеты «Звязда» Валянціны Доўнар, якая прэзентавала тут сваю новую кнігу «Каб сказаць... і пачулі». Побач адбывалася дзея, якая прыцягнула ўвагу аматараў творчасці Якуба Коласа. Кнігу «Якуб Колас. У думках, у сэрцах, у песнях» прэзентавалі сын беларускага класіка, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, доктар тэхнічных навук Міхась Міцкевіч і галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар Шніп.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

■ Факт

МКАД стане камунальнай уласнасцю

Да 10 лютага кальцавая дарога вакол Мінска (аўтадарога М-9) і ўчастак аўтадарогі М-4 Мінск — Магілёў (12-15 кіламетры), якія зараз знаходзяцца ў гаспадарчым падпарадкаванні ўнітарнага прадпрыемства «Мінскаўтадар-Цэнтр», з рэспубліканскай уласнасці бязвыплатна пяройдуць у камунальную ўласнасць сталіцы.

Як патлумачылі ў прэс-службе Мінтранса, неабходнасць змены ўласніка звязана найперш з тым, што аўтадарога М-9 і ўчастак аўтадарогі М-4, які з'яўляецца працягам Партызанскага праспекта, размешчаны ў адміністрацыйных межах Мінска і забяспечваюць функцыянаванне ўсяго разнастайнага комплексу гарадскіх задач: ад развіцця інфраструктуры гарадскіх камунікацый да забеспячэння ўнутрыгарадскіх пасажырскіх і грузавых перавозак. Фактычна МКАД і ўчастак М-4 выконвае функцыю гарадскіх магістраляў непарыўнага руху.

Знаходжанне Мінскай кальцавой дарогі і ўчастка М-4 у камунальнай уласнасці сталіцы і гаспадарчым вядзенні спецыялізаваных арганізацый, падпарадкаваных Мінскаму гарвыканкаму, дазволіць аператыўна вырашаць пытанні, звязаныя з рамонтам сетак водаправода, каналізацыі, электра- і газазабеспячэння, сувязі, добраўпарадкаваннем і размяшчэннем аб'ектаў рознага прызначэння на прыдарожнай тэрыторыі аўтадарог, а таксама іншых задач, што адносяцца да камунальнай гаспадаркі. Дагэтуль вышэйзгаданыя пытанні для Мінгарвыканкама былі праблематычнымі ў вырашэнні, бо аўтадарога М-9 і ўчастак М-4 мелі статус аўтамабільных дарог агульнага карыстання.

Разам з МКАД і ўчасткам аўтадарогі М-4 у гарадскую гаспадарку пяройдзе шэраг будынкаў, збудаванняў, перадатачных устройстваў, машын, абсталявання, транспартных сродкаў і іншай маёмасці, што выкарыстоўваецца для забеспячэння ўтрымання і рамонту вышэйзгаданых аўтамабільных дарог. Гэты маёмасны комплекс павінен быць перададзены да 1 красавіка.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

БАБУЛІНА СПАДЧЫНА?

Праз 13 гадоў пасля смерці бабулі яе 37-гадовая ўнучка вырашыла разабрацца з усім тым, што засталося сваякам у спадчыну. Сярод рэчаў у хляве на тэрыторыі дома-ўладання жыхарка вёскі Гародзічы Калінкавіцкага раёна нечакана знайшла абрэз вінтоўкі «Мосіна» калібру 7,62 мм узору 1891—1930 гадоў. Зброю жанчына добраахвотна аддала праваахоўнікам.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.



КАМУ ЯК ПАШАНЦУЕ

У нас, на Мёршчыне, дзе ў старажытнасці праходзіў шлях «з варагаў у грэкі» і дзе проста безліч азёраў, рэк і рэчак, як і варта чакаць, багата рыбаловаў. Ёсць сярод іх проста фанаты-аматары, ёсць — так званыя прафесіяналы. Першыя абабягаюць берагі не толькі блізкіх вадаёмаў: летам з вудамі, спінінгамі і донкамі, зімой з блешнямі, мармышкамі і жарліцамі ў пошуках удачы яны могуць «заблудзіцца» нават да суседзяў на Браслаўшчыну. Для шалёнага сабакі сем вёрст не круг, як той казаў! А ўсё дзеля чаго? Дзеля таго, каб пацешыць душу падчас самога «працэсу». І, вядома ж, каб прынесці ў сям'ю хай невялікі, але свой улоў.

Што да так званых прафесіяналаў, то, нідзе не працуючы, яны ўвесь свой вольны час (а ён у іх вольны ўвесь!) аддаюць пошукам здабычы, а потым — абмену... На што? Гэта як пашанцуе: калі — на грошы, калі — адразу ж на вядомыя напоі. Бо, каб паласавацца рыбкай, многія пенсіянеры (і асабліва адзінокія жанчыны), загадзя купляюць тую «бомбу» ці дзве...

Дык вось. Аднойчы двое сябрукоў-»прафесіяналаў», як ні цяжка было, падняліся зацемна, можна сказаць, навобмацак паставілі па дзесяць жарліц (больш не дазваляе рыбнагляд) — сталі (пасля ўчарашняга «трубы смылелі») назіраць за сігналізатарамі паклёвак. І вось — шчасце якое! — засвяціўся сцяжок у аднаго! Пашанцавала: шчупачок!.. Кіламетра на паўтара! І ўжо на лёдзе!

Праз нейкі час усміхнулася ўдача і другому. Ён, праўда, «крыміналку» падняў, рыбінку грамаў на трыста. Па законе ды і на добры толк яе трэба было б адпусціць пад лёд. Але ж дзе там — у якасці даважку сябрукі і яе ўзялі. Склалі здабычу ў пакет і, як заўсёды, адзін з іх подбегам ірвануў да вёскі, у дамоўлены «пункт абмену».

Прыбег да «заказчыцы» ў хату, стаў даставаць «прадукцыю» і разгубіўся: няма ў пакеце даважка: толькі быў — і раптам знік, як той казаў. Выпаў, відаць... Праз дзірку ў пакеце.

Але ж гэта не бяда: з дарогі рыбку падняць — не з вады.

Паабяцаў рыбак, што ўмомант гэта зробіць. І хуткім крокам — адна нага тут, другая там — рушыў...

Як на тое ліха, па той самай вулцы, у той жа самы час адзін з вяскоўцаў ішоў на абед. Па баках, мусіць, не дужа вароніў — больш пад ногі глядзеў. Таму ў адным месцы і стаў, як укапаны: што за ліха, думае, жывы шчупачок на вуліцы ляжыць! Ну ці ж не ўдача?!

...Як бачым, злавіць рыбку можна, не толькі рана ўстаўшы і добра памерзнуўшы на возеры, але і на асфальце.

Як каму пашанцуе.

Альфрэд ТЫЧКО,
в. Ідолта, Мёрскі раён.

УСЁ Ў АЖУРЫ...

Гэту гісторыю любіў распавядаць наш бацька, а адбылася яна даўно, гадоў сто таму.

У нашу вёску Горна (адкуль, дарэчы, родам паэты Алена Таболіч, Юрка Голуб, Данута Дабрыніна-Чыркун, вядомы афтальмолаг Уладзімір Кулік ды іншыя), царскія ўлады прыслалі настаўніка. Не ў памяці ўжо, дзе яго пасялілі, а вось харчавацца ён павінен быў у людзей — у сем'ях сваіх вучняў, кожны дзень у новай...

Вось даходзіць чарга да хаты Максімчыхі. Хвалюецца кабета: як жа прыняць такога шаноўнага чалавека, чым жа яго накарміць?

Стала ў іншых жанчын выпытваць, што яны гатавалі, што настаўнік найбольш любіць.

Сказалі: гарбату...

Ну што тут будзеш рабіць: падалася кабета ў краму, на апошнія грошы купіла яе, а вось як гатаваць-падаваць, хоць забі, не ведае. І пытацца няёмка, і чытаць не ўмее...

Ну і зрабіла ўсё, як розум падказаў: гэта значыць, увесь пачак (настаўніку ж! Каму іншаму, можа, і шкада было б...) усыпала ў казанок, закіпяціла, адцадзіла. Потым смачнейшае (гэта, вядома ж, гушчу) высыпала ў міску і на стол — да іншых страў паставіла.

Што сама? Ды вядома ж — прывеціла настаўніка, пасадзіла, стала непадалёк, каб нешта падаць, калі спатрэбіцца, а заадно — паглядзець, як жа чалавек будзе есці.

Трэба сказаць, што апетыт у настаўніка быў неблагі: і тое ён да сябе падцягнуў, пакаштаваў, і гэта... На міску з гарбатай хіба не глядзіць. А гаспадыні ж крыўдна: грошы заплачаны! Дык Максімчыха яму:

— Ешце ж, паночку, ешце... І гарбатку нашу бярыце.

Настаўнік ёй:

— Дзякуй... Я ж ем...

Максімчыха:

— Г... ты ясі... Гарбату еш!

...Без каментарыяў, як кажуць. Але ж... з успамінам.

Ужо ў нашы часы ўнук той самай Максімчыхі стаў брыгадзірам у мясцовым калгасе. Шкодная праца: здароўе на ёй страціць, як ката з печы скінуць — лёгка. Вось і той унук прафесійную хваробу займеў, гэта значыць, чым больш працаваў, тым часцей зазіраў у чарку, а радзей — на фермы ды палі. Бульбяное ў той год толькі напалову засеяў (ці то насенкі не хапіла, ці то часу...). Факт, што гуляла зямля: пад жоўтай свірэпай.

А тут, як на ліха, у вёску ўпаўнаважаны прыязджае. Як водзіцца, перш-наперш палудную ў брыгадзіра (вядома ж, з не адной яечняй і не адной чаркай...). Потым удваіх яны едуць на палі з так званай «рэвізіяй». Але ж гаспадар не дурань: блізка да таго бульбянога поля прыезджага не падвозіць — здалёк паказвае: тут, маўляў, бульба пасаджана, сінім цвіце.

Правяраючы:

— А жоўтым што?

— Жоўтым?.. Ды новы гатунак — ракаўстойлівы.

...Трэба сказаць, што той упаўнаважаны ў сельскай гаспадарцы разбіраўся, як свіння ў памідорах. Таму «наверх» і далажыў, што ў брыгадзе поўны парадак: «усе палі засеяны, усе сенажаці»... Усё цвіце. Значыць, быць ураджаю.

Мікалай Іванавіч ІГОЛКА,
г.п. Зэльва.

КАЛІ ЖАНЧЫНА КАЖА «НЕ»...

...Гэтая маршрутка ехала з Мінска ў Рагачоў, і ўсё было, як звычайна. Там, дзе трэба, яна спынялася: нехта выходзіў, нехта — заходзіў... У тым ліку, у Бабруйску — высокая і, па сённяшніх мерках, досыць прывабная дзяўчына («макароніна», як сказаў бы пра яе гумарыст Задорнаў)...

Але яна, мусіць, гэтага не чула. Апынуўшыся ў салоне, пакруціла галавой, выбрала сабе месца, села, тут жа дастала «мабілку». «Ну ты што?» — досыць гучна спытала ў некага. Той, у каго пыталася (як высветлілася потым, яе кавалер), нешта адказаў. На што дзеўка заявіла: «Я не паеду!» Ён, відавочна, пачаў угаворваць. Аднак не на тую нарваўся! «Не!.. Нізавошта!.. Я не сяду ў машыну! — праз кароткія паўзы, на ўвесь салон кідала дзяўчына. — Я ведаць цябе не хачу!.. Мне ўсё сказалі! Ты ж іншую завёў! Не прыяджай! Не сяду... Не паеду... Нават не мар!»

Пасажыры заклапочана пераглядваліся, ківалі галовамі, угору падымалі вочы... Некаму гэтае высвятленне адносін перашкаджала чытаць, некаму драмаць. Усім яно было нецікавым! Але «макароніна» ні на што не звяртала ўвагі: яна доўга і больш чым настойліва адмаўляла хлопцу ў сустрэчы.

Потым ён, мусіць, спытаў, дзе ж яна знаходзіцца? «У маршрутцы», — адказала дзеўка. І праз паўзу дадала, што людзі побач сапраўды ёсць, што чуюць... І няхай сабе...

Хлопец пасля гэтага размову скончыў: яму, відаць, няёмка стала. Сціхла і дзеўка. Маршрутка тым часам даехала да рагачоўскага вакзала. Людзі падаліся на выхад. Следам за імі рушыла і «макароніна»: выйшла з салона і...

Пасажыры вачам не паверылі: лёгенька, роўненька пайшла да... легкавіка з запэцканымі нумарамі. Рашуча адчыніла ў ім дзверцы і, забыўшыся на шматлікія «Не!», «Нізавошта!» і «Ніколі!»... села. Машына тут жа рванулася з месца — далей ад людзей, якія аж перагіналіся ад смеху.

...Гумарыст Задорнаў, значыць, правільна заўважыў: калі жанчына кажа «не», то насамрэч гэта «так», але... пазней.

Соф'я КУСЯНКОВА,
в. Лучын, Рагачоўскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

ОАО «Гранд Фэшен Хаус»

11 марта 2013 года в 12.00
ПРОВОДИТ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ
по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13 , каб. 16

Повестка дня:

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества в 2012 году и основных направлениях деятельности общества в 2013 году.
2. Отчет совета директоров общества.
3. Отчет ревизионной комиссии общества.
4. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности общества за 2012 год.
5. Утверждение направлений использования чистой прибыли общества на 2013 год и 1 квартал 2014 года.
6. Избрание членов совета директоров общества.
7. Избрание членов ревизионной комиссии общества.
8. О размере вознаграждения членам совета директоров и ревизионной комиссии общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13 (кабинет директора) с 06 по 07 марта 2013 года с 9.00 до 16.00 либо 11 марта 2013 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания проводится с 11.00 до 12.00 в день и по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 01 марта 2013 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 290671335

Совет директоров.

Ад «Сярэбранага капытка»...

Хто з дзяцінства палюбіў кнігу, не развітаецца з ёю на працягу жыцця

Сказаць, што я люблю чытаць, — гэта не сказаць нічога. Чытаю, колькі сябе памятаю. А канкрэтна — з пяці гадоў. Якім чынам асвоіла працэс — у памяці чамусьці не захавалася. Былі, вядома ж, у сям'і дзіцячыя кніжкі з малюнкамі, кубікі з літарамі, азбука. Відаць, займаліся бацькі-філолагі і бабуля, якая жыла з майго трохгадовага ўзросту з намі, пераехаўшы са Смаленшчыны. Затое назаўсёды запомніла той момант, калі ўзяла ў рукі тоненькую кніжачку (хаця дзіцяці яна тады такой не здавалася — хутчэй, наадварот) і нечакана для сябе... пачала чытаць. Гэта была казка Паўла Бажова «Сярэбраны капыток» — з красамоўнай серыі «Мае першыя кніжкі». Сапраўды, яна сталася першай. І, што дзіўна, з таго часу кніжка захавалася. Не спецыяльна, неяк само атрымалася. Кніжка, якая маладзей за мяне ўсяго на тры гады...

Першай сваім уменнем я здзівіла маму. А затым мы з ёй удзвюх — тату, які прыехаў з санаторыя. Той, праўда, засумняваўся: а ці не вывучыла дачка казку на памяць? І толькі робіць выгляд, што чытае. Ён для праверкі ўручыў мне якуюсьці тоўстую газету, выбраўшы артыкул. Я прачытала і яго, заслужыўшы, нарэшце, яшчэ порцыю захаплення. На гэты раз — татавага.

Потым было яшчэ шмат кніжак, у тым ліку і на беларускай мове. У першым класе вельмі палюбіўся буквар А. Клышкі, затым — разнастайныя чытанкі...

Атрымліваецца, што з кнігай я не развітваюся ўжо 37-ы год! Нядаўна ўпершыню задумалася пра гэта. А вось колькі прачытала асобнікаў — цяжка сказаць. Можа, мільён? І нават не адзін... Спрабавала весці «Дзённікі чытача», куды запісвала кароткі змест прачытанага і свае ўражанні. Напачатку — для сябе. Падчас вучобы на факультэце беларускай філалогіі і культуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М.Танка (завочна) — па патрабаваннях выкладчыкаў. Памятаю тыя доўгія спісы беларускай, рускай і замежнай літаратуры, абавязковай для прачытання і занатоўкі зместу. 60-70, а то і больш назваў. Я педантычна прачытвала іх усе!

Тым, хто, пачуўшы пра завочную адукацыю, грэбліва махае рукой — маўляў, толькі стацыянар, запэўню: усё залежыць ад чалавека, ад яго стаўлення да вучобы. Хтосьці і на стацыянары будзе бібікі біць, а хтосьці на завочным — угрызацца ў навуку. Зрэшты, самаадукацыя мне заўсёды была даспадобы.

Асабіста я вельмі ўдзячна сваім выкладчыкам з педагагічнага ўніверсітэта за іх патрабавальнасць. Пяць гадоў вучобы з абавязковым прачытаннем мора кніг, і не толькі мастацкіх, апрача неабходных ведаў, далі мне такое агульнае развіццё! Я нават яго адчула, як штосьці цалкам матэрыяльнае. І вось адзін невялікі прыклад — у доказ.

У сяброўкі маёй сяброўкі (а мы ўсе разам працавалі настаўніцамі ў СШ №4 г.Чэрвеня) было вельмі багатае ўяўленне, маўленне і тое самае агульнае развіццё, якога, па маім меркаванні, у 20 гадоў мне не хапала. У яе прысутнасці я старалася адмоўчвацца. Словам, займела яшчэ адзін комплекс. І якім жа было маё здзіўленне, калі праз 3-4 гады вучобы я адчула, што магу размаўляць з ёю на роўных! Асалода — словамі не выказаць!

Калі ж праз шмат гадоў я распавяла маёй колішняй каляжанцы пра тагачасныя ўражанні, адчуванні і пакуты, яна вельмі здзівілася. Маўляў, нічога такога тады не заўважала. Стасункі як стасункі. Відаць, дакладна — комплексы мае. Але ж менавіта яны падштурхнулі да развіцця.

Кнігі, кнігі, кнігі... Як радавалі яны, атрыманыя ў падарунак (і абавязкова — з дароўным надпісам!) з самых розных нагод: у дні народзінаў, за выдатную вучобу і актыўную грамадскую дзейнасць. За перамогу ў раённых шахматных спаборніцтвах — ад бацькоў. І ад іх жа нават... да 40-годдзя Вялікай Перамогі! Прычым я атрымала кнігу, на той час надзвычай папулярную сярод школьнікаў, — «Фантазіі Баранкіна» Валерыя Мядзведзева. Памятаеце крылаты выраз?! «Баранкін, будзь чалавекам!»?

Але каб пералічыць усе кнігі, якія паўплывалі на мяне, запалі ў душу, не хопіць і таўшчэзнага тома. Таму згадаю толькі яшчэ некалькі.

Перабіраючы хатнюю бібліятэку, знаходжу прызабытую (таксама з дзіцячых) аповесць Лідзіі Абуховай «Зорны сын Зямлі» — пра Юрыя Гагарына. Улічваючы, што зараз у космасе мой аднакласнік Алег Навіцкі — каштоўная знаходка! І зноў кніжка

Кнігі, кнігі, кнігі... Як радавалі яны, атрыманыя ў падарунак (і абавязкова — з дароўным надпісам!) з самых розных нагод: у дні народзінаў, за выдатную вучобу і актыўную грамадскую дзейнасць. За перамогу ў раённых шахматных спаборніцтвах — ад бацькоў. І ад іх жа нават... да 40-годдзя Вялікай Перамогі!

трымаць яе ў руках. Здаецца, нейкае цяпло сыходзіць...

Безумоўна, прыемна мець на кніжнай паліцы і ўласны зборнічак вершаў (без прэтэнзій на высокамастацкасць!), выдадзены невялікім накладам Чэрвеньскай цэнтральнай раённай бібліятэкай у 2005 годзе (за што вельмі ўдзячна!), калектыўныя зборнікі «Мая Ігуменшчына-2» і «Мая Ігуменшчына-3», дзе таксама ёсць мае паэтычныя радкі.

Шмат маю і набытых альбо падораных кніг з аўтографамі творцаў. Уладзімір Арлоў «Каханак Яе Вялікасці», Вольга Іпатава «Апошнія ахвяры свяшчэннага дуба», Галіна Арлова, Леанід Екель «Тры Я», Барыс Стральцоў «Капуснік, або Лад жыцця», Уладзімір Кароль «Крылы Пецярбурга», Леанід Дранько-Майсюк «Анёлак і я», Эдуард Акулін «Вітражы» ды іншыя. А больш за ўсё — твораў земляка, настаўніка, сябра пісьменніцкага Саюза Генадзя Аўласенкі з Чэрвеня — зборнік вершаў «Час збіраць камяні», містычны трылер «Гісторыя замест матэматыкі», фантастыка «Дзікія кошкі Барсума», дапаможнік для паэтаў-пачаткоўцаў «Азы вершаскладання»...

Мне падаецца, што той, хто з дзяцінства палюбіў кнігу, не развітаецца з ёю на працягу жыцця. І як бы ні змяняліся тэндэнцыі ў літаратуры, кожны твор сапраўды знойдзе свайго чытача.

Святлана АДАМОВІЧ.
Фота аўтара.

■ Акцэнты тыдня з Вадзімам Гігіным

СВОЙ ПАЧЭСНЫ ПАСАД

У НАС. Нарэшце мы можам адчуць сябе першымі сярод роўных. Менавіта такі статус набыла Беларусь, афіцыйна прыняўшы старшынство ў Садружнасці незалежных дзяржаў. Якраз на гэтым тыдні, 4 лютага, у Мінску прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя такой значнай падзеі.

Што канкрэтна дае месца старшыні ў СНД? На першы погляд, нічога істотнага. Але беларусы славяцца тым, што знаходзяць прымяненне любой прыладзе, нават калі іншыя ўжо махнулі на яе рукой.

Садружнасць — гэта вельмі добрая пляцоўка для вырашэння розных дыпламатычных пытанняў, у тым ліку і складаных. Атрымліваецца, што на цэлы год гаспадаром такой пляцоўкі становіцца Мінск. І трэба думаць, будзе гаспадаром ветлівым і гасцінным. А ў міждзяржаўных адносінах г.зв. «добрыя паслугі» граюць вельмі важную ролю і маюць самае канкрэтнае прызначэнне.

Калі паглядзець на праграму беларускага старшынства, то відавочна першы асноўныя кірункі дзейнасці: эканоміка, экалогія і гуманітарна-культурная сфера. У эканоміцы перад нашай краінай стаіць зусім не простая задача: прымусіць працаваць пагадненне пра стварэнне зоны свабоднага гандлю. На жаль, гісторыя выканання такіх дамоўленасцяў краінамі — удзельніцамі СНД, мякка кажучы, не вельмі добрая.

З экалогіяй таксама ўсё зразумела. 2013-ы афіцыйна абвешчаны ў СНД Годам экалагічнай культуры і аховы навакольнага асяроддзя. А тут беларусам ёсць чым пахваліцца. Акрамя таго, з'яўляецца магчымасць накіраваць больш сродкаў з бюджэту Садружнасці на прыродаахоўныя мерапрыемствы.

Цікава, што падчас старшынства нашай краіны ў Беларусі акажуцца не адна, а цэлых дзве сталіцы СНД. Мінск — палітычная і дыпламатычная, а Магілёў — культурная. Таму трэба чакаць, што цяперашні год і сапраўды пройдзе пад знакам супрацоўніцтва з дзяржавамі Садружнасці.

ВАКОЛ НАС. У Бруселі адбылася вельмі знакавая сустрэча. Прэзідэнт Сербіі Таміслаў Нікаліч правёў кароткія перамовы з кіраўніцай г.зв. «Рэспублікі Косава» Аціфетай Як'ягай. Сербскі лідар потым прызнаўся, што нават паціснуў руку сваёй суразмоўцы.

Косаўскае пытанне — адно з самых складаных і балючых ва ўсім «балканскім клубку». Косава і Метохія — калыска сербскай дзяржаўнасці і культуры. Калі запытаць «Адкуль пайшла сербская зямля?», то адказ будзе адназначны — з Косава. У часы турэцкага панавання сюды мэтанакіравана былі перасялены албанцы, якія прынялі ісламізм. Потым палітыку падтрымкі албанцаў працягнулі камуністычныя ўлады, што стварылі Аўтаномны край Косава ў межах сацыялістычнай Сербіі. І ўсё было б нічога, калі б албанцы не пачалі адкрыта выціскаць сербаў з Косава, здзекавацца з помнікаў іх культуры. У адказ Бялград скасаваў косаўскую аўтаномію. Канфлікт выкарысталі ЗША і краіны ЕС, каб умяшацца ў справы Сербіі і правесці вайсковую аперацыю. Так Косава стала «незалежным».

Большая частка сербаў выгнана з краю. Астатнія жывуць фактычна ў некалькіх ізаляваных гета. Разбураны дзясяткі ўнікальных цэркваў і манастыроў, што занесены ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. І ўсё гэта было зроблена пад наглядам войскаў НАТА і эмісараў ЕС.

Зараз Сербія стаіць перад адным з самых складаных выбараў у сваёй гісторыі. Кіраўніцтва краіны заявіла пра жаданне ўступіць у Еўрасаюз. Кошт усім вядомы — прызнанне албанскага Косава. Гэта будзе азначаць здраду тым сербам, што павінны былі пакінуць свае хаты і збегчы (а таксама і тым, каму хапіла мужнасці застацца), здраду гістарычнай памяці. Іншымі словамі, гэта будзе неверагоднае прыніжэнне сербскай нацыі, якое яна не перажывала з часоў Асманскай імперыі.

Што пераможа: палітычны разлік альбо нацыянальная годнасць? Пакуль прэзідэнт Нікаліч заявіў, што ніколі не прызнае незалежнасці Косава.

З ГІСТОРЫІ. 4 лютага 1933 года польскі суддзя ў Вільні рыхтаваўся вынесці прысуд, якога чакалі тысячы беларусаў. На лаве падсудных былі Фелікс Стацкевіч, Рыгор Шырма, Юльян Саковіч, Яўген Скурко (Максім Танк) ды іншыя — усяго шэсць чалавек, прадстаўнікі Таварыства беларускай школы. Іх абвінавацілі ў падрыхтоўцы «камуністычнай змовы» супраць Другой Рэчы Паспалітай.

Таварыства беларускай школы (ТБШ) — незабыўная старонка нацыянальнай гісторыі. Звычайна гісторыкі пішуць, што яно працягнула традыцыі самай вялікай айчыннай партыі першай паловы XX стагоддзя — Беларускай сялянска-работніцкай грамады, якая была ў сакавіку 1927 года забаронена польскімі ўладамі. Фармальна гэта так. Нават кіраўніцтва ў гэтых дзвюх арганізацый было амаль аднолькавае: Браніслаў Тарашкевіч, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Пётра Мятла. Аднак, на маю думку, карані той справы, якую рабіла ТБШ, трэба шукаць глыбей. У нашай гісторыі ўжо быў перыяд, калі суцэльная паланізацыя ставіла пад пагрозу само існаванне беларускага народа — XVII стагоддзе. Тады на абарону старабеларускай культуры сталі брацтвы. Калі параўноўваць дзейнасць ТБШ і брацтваў, то яна вельмі падобная: адкрыццё школ, адстойванне роднай мовы, выпуск літаратуры, а галоўнае — гуртаванне вакол сябе лепшых людзей краіны.

ТБШ даводзілася працаваць у зусім неспрыяльных умовах. Тады нават за спробу адправіць тэлеграму на беларускай, украінскай ці рускай мове маглі выкінуць з пошты, арыштаваць. І ўсё ж вынікі яе дзейнасці ўражваюць. За кароткі час удалося стварыць больш за 500 гурткоў, якія аб'ядналі ад 15 да 30 тысяч чалавек. Пададзены ўладам заявы на адкрыццё 1229 школ (дазволілі адкрыць толькі 78 беларускіх і польска-беларускіх). А яшчэ — уласнае выдавецтва, дзясяткі найменняў кніжак, тэатральныя, харавыя гурткі, бібліятэкі. Ды што там казаць! Калі зараз гаворым пра неабходнасць стварэння грамадзянскай супольнасці, то лепшага прыкладу, чым ТБШ, цяжка і знайсці.

Зразумела, што ва ўмовах страшэннага палітычнага ціску, які адчуваў беларускі рух у міжваеннай Польшчы, ТБШ не магло заставацца па-за палітыкай. Таварыства актыўна супрацоўнічала з Камуністычнай партыяй Заходняй Беларусі. Падтрымліваліся сувязі і з БССР. Хоць у тых адносінах не ўсё было гладка, часам даходзіла і да канфліктаў, узаемных абвінавачванняў. А гэта для рэжыму санацыі было тоесна злачынству. І ўсё ж ні пра якую падрыхтоўку паўстання гаворка не ішла.

Нават віленскі суддзя вымушаны быў зняць абвінавачванне ў «камуністычнай змове». Праўда, прыгаварыў да турэмнага зняволення траіх з падсудных, у тым ліку і Максіма Танка.

Рост папулярнасці ТБШ сярод беларускага насельніцтва раздражняў пілсудчыкаў. 2 снежня 1936 года Таварыства было забаронена. А беларусам застаўся прыклад шчырай і палымянай барацьбы за нацыянальную годнасць і спадчыну.

gigin@belta.by
info@zvyazda.minsk.by

■

■ Гэта наша з табой біяграфія

ХРОСНЫ СЫН ПАДПОЛЬНАЙ «ЗВЯЗДЫ»

Менавіта так можна сказаць пра Барыса АЛЕКСАНДРОВІЧА, які 11 лютага адзначыць 75-гадовы юбілей

Калі ў маі мінулага года праграма «Панарама» здымала вялікі сюжэт да 70-годдзя выхаду падпольнай «Звязды», Барыс Александровіч выступаў у ролі своеасаблівага гіда па музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. І невыпадкова: яго бацька Хасан Мустафавіч Александровіч у 1942-м, у акупаваным Мінску, быў наборшчыкам падпольнай «Звязды».

Барыс Хасанавіч не толькі даўні і надзейны сябар нашай газеты, ён — сапраўдны звяздовец. Гэта званне перададзена яму ў спадчыну ад бацькі — як і адчуванне газеты, аддонасць і вернасць традыцыям, якія закладвалі нашы папярэднікі.

І яшчэ адна досыць красамоўная дэталь. Летась, напярэдадні святаў Дня друку і Дня Перамогі, мы прыйшлі да помніка «Звяздзе», што на вуліцы Кульман, — на гэтым месцы, на колішняй вуліцы Выдавецкай, у доме Таццяны Яўменаўны Якавенкі знаходзілася падпольная друкарня, дзе ў пакоі Арсенія Сяргеевіча Грышына летам 1942 года надрукаваны 2-і і 3-і нумары «Звязды»; крыху пазней, восенню таго ж года, падпольшчык быў схоплены немцамі і закатаваны ў турме... Гэта ўжо традыцыя: прыходзіць да помніка, каб навесці парадак, прыбраць-падмесці... Якім жа было здзіўленне, калі ўбачылі: ужо ўсё акуратна зроблена, і да помніка пакладзены свежы вяночак. Хто ж гэты добры, чулы чалавек, які паклапаціўся пра звяздоўскі помнік?

Адразу падумалася: мабыць, Барыс Хасанавіч Александровіч? Увечары патэлефанавала ўдакладніць — і сапраўды, гэта ён...

❑❑❑

— «Звязда» для мяне — газета родная. Бацька рызыкаваў жыццём за газету. Не толькі сваім жыццём — але жыццямі ўсіх членаў сям'і: жонкі, дваіх маленькіх дзяцей. Я нарадзіўся ў 1938 годзе, сястра — у 1940-м... Калі б хто выдаў, нас усіх расстралялі б. Лёс многіх мінскіх падпольшчыкаў быў трагічным... А ўявіце, па якім лязе хадзіў штодня бацька: літаральна ж праз дарогу ад нашай хаты, на вуліцы Выдавецкай, было гестапа! — расказвае Барыс Хасанавіч. — Ва ўмовах акупаванага Мінска выпусціць газету было не тое што вельмі складана — амаль немагчыма. З падкантрольнай немцамі друкарні трэба было незаўважна вынесці ўсе шрыфты, фарбу... І тэкст набіраўся па літарцы! Маці для кожнай літары сшыла мяшэчак. Уявіце: з кожнага мяшэчка трэба было дастаць літару, пакласці на вярстатку — каб атрымалася слова, потым сказ, потым тэкст... А потым водзіск зрабіць, накатаць фарбу... А потым «зрабіць тыраж»: не ведаю, колькі — сто або дзвесце экзэмпляраў за ноч мог «адкатаць» бацька. Каб выйшла газета! Зараз, калі з'явіліся камп'ютары, многія і не ўяўляюць, наколькі цяжка было рабіць газету ў тыя трагічныя для нашай Радзімы часы.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Рукой наборшчыка падпольнай «Звязды» Хасана Мустафавіча Александровіча набраны другі, трэці і чацвёрты нумары газеты. Сёння яго сын Барыс Александровіч паказвае, як друкавалася «Звязда» (фрагмент экспазіцыі Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны).

Тады, у час вайны, маленькі Барыс не разумеў, што да чаго. Ён толькі чуў, як перашэптваліся бацькі, да яго даляталі словы «газета», «лістоўкі», «шрыфт»... Усе падрабязнасці працы над падпольнай «Звяздой» бацька расказаў ужо пасля вайны. І не толькі бацька: маці, Галіна Адамаўна, таксама чым магла дапамагала падпольшчыкам. Распаўсюджвала лістоўкі. Абгортвала лістоўкамі маленькую дачку, каб варожыя вочы нічога не ўбачылі... Аднойчы ў час аблавы да Александровічаў прынеслі рэдакцыйны шрыфт — трэба было тэрмінова схаваць. І жанчына не разгубілася, схавала шрыфт у бульбе: дакладней, закапала пад бульбу, якая расла ў агародзе.

— Мне запомнілася: позна ўвечары, амаль ноччу, вяртаецца бацька дадому (як потым высветлілася, аддрукаваўшы-адціснуўшы некалькі дзясяткаў нумароў «Звязды»), а мы, дзеці, бяжым да яго: можа, прынёс што-небудзь з'есці. А ён у нейкай роспачы махнуў дзвюма рукамі... Бацька вельмі рана пайшоў з жыцця, у 1959 годзе, вельмі малады. Яго падкасіла вайна.

❑❑❑

...Самы моцны ўспамін дзяцінства Барыса Александровіча — зусім не дзіцячы. Ён і цяпер да драбніц помніць тыя жахлівыя адчуванні і ўражанні: «Калі бамбілі Мінск, я стараўся як мага шчыльней прыпасці да зямлі... Не магу забыць: каля нашай хаты на дрэве вісела шпакоўня, акурат у яе і трапіў асколак снарада. Шпакоўню разнесла ўшчэнт, на зямлі валяліся забітыя птушаняткі. Гэта і цяпер перад вачамі стаіць... Пазней каля хаты мы выкапалі зямлянку, якая стала ў вайну нашым другім домам».

У сярэдзіне вайны Хасан Мустафавіч перабраўся ў партызанскі атрад імя Суворава, а сям'я заставалася ў Мінску. «Партызаны нам дапамагалі прадуктамі, інакш мы не выжылі б. Але ўсё роўна вельмі галадалі. Мне ўвесь час хацелася хлеба. Помню, падышоў да немцаў, якія весяліліся, смачна пілі-закусвалі (дзіця!..), папрасіў у іх лустачку хлеба. А перакладчык сказаў: «Афіцэры прапануюць: вып'еш шклянку гарэлкі — дадуць табе буханку хлеба». Мне, пяцігадоваму, працягваюць гарэлку. І я выпіў яе: вельмі ж хлеба хацелася... Мне далі буханку хлеба, але што было далей, не памятаю... Яны проста здзекаваліся з нас!»

Пасля заканчэння школы Александровіч вырашыў пайсці шляхам бацькі: працаваў у друкарні Акадэміі навук наборшчыкам, прычым высветлілася, што ў яго сапраўдны дар мастака... Пазней перайшоў у політэхнічны інстытут, арганізаваў там друкарню.

Два сыны, трое ўнукаў добра ведаюць гісторыю сям'і, ганарацца дзедам і прадзедам.

Таццяна ПАДАЛЯК.

Звяздоўцы ўсіх пакаленняў шчыра віншуюць Барыса Хасанавіча Александровіча з юбілеем! Зычым добрага здароўя, натхнення, плёну ва ўсіх справах!

■

ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

■ Свой погляд

ШЧАСЛІВАЙ ДАРОГІ

...Нехта з вялікіх казаў: «Загавары, каб я ўбачыў цябе і даведаўся, хто ты». Некалі культурай у адзенні, паводзінах, стылі жыцця вылучаліся інтэлігенты. Але ж найперш іх пазнавалі па мове.

Што цяпер? Прыслухайцеся да гутаркі так прыгожа апранутых людзей, і, баюся, знікне знешняя прыгажосць, бо часта з іх з вуснаў не зрываюцца, а менавіта сыплюцца такія словы, што ўсё навокал імгненна чарнее. Лаянка льецца з усіх бакоў: на вуліцах, у транспарце, на стадыёнах, льецца з вуснаў мужчын і жанчын, маладых і старых. Ды што там — нават дзяцей, асабліва — у час гульняў... Яны, баюся, так часта чуюць ненарматыўныя словы, што лічаць іх цалкам нармальнымі.

Чуюць ад дарослых, ад нас.

Між тым, ужываючы ненарматыўную лексіку, мы перш за ўсё зневажаем сябе. Ісус Хрыстос сказаў: «Не тое апаганьвае чалавека, што ўваходзіць у яго вусны, а тое, што з іх выходзіць».

Ужыванне «брудных» слоў вядзе да гарманальных парушэнняў, асабліва — у жанчын.

Што да мужчын, то ім, як сцвярджаюць вучоныя, пагражае ранняя імпатэнцыя.

Але самае страшнае, што пад уздзеяннем брыдкаслоўя храмасомы актыўна мяняюць сваю структуру, у малекулах ДНК выпрацоўваецца «адмоўная праграма», якая перадаецца нашчадкам на генным узроўні. Вучоныя называюць такі працэс «праграмай самаліквідацыі».

Раздражняцца, сварыцца, а тым больш мацюкацца шкодна і небяспечна не толькі для чалавека, але і для ўсяго жывога свету. І наадварот. Неяк чытала, што, напрыклад, на Мальце лечыць людзей не толькі мяккі і цёплы клімат, марскія брызы, чыстая вада і сонца. Цэрквай там столькі ж, колькі дзён у годзе, а таму галоўным лекавым сродкам з'яўляецца... паветра, бо яно — намоленае.

Некалі ненарматыўнай лексікі наша мова не мела наогул. Сведчаннем таму і народная мудрасць. Вы чулі: «Чым брыдкае слова сказаць, лепш язык выплюнуць», «Што сказаў, тое святое», «Добрае слова — што посах у рукі».

І вось гэта, дарэчы, чыстая праўда.

Вёска мая Хатынічы — самая вялікая ў раёне. У ёй каля 30 вуліц. Тая, па якой праходзіць дарога Ганцавічы — Пінск, цягнецца кіламетраў на шэсць.

Раённыя маршрутныя аўтобусы маюць тут тры ўзаконеныя прыпынкі, міжгароднія — толькі адзін, у цэнтры вёскі. Таму едзеш, на прыклад, аўтобусам Мінск — Пінск, праязджаеш свой дом, а потым амаль тры кіламетры ідзеш да яго пехатой. Для людзей маладых гэта, вядома ж, не адлегласць. А вось для пажылых ды ў дрэнnае надвор'е...

Таму я, напрыклад, яшчэ задоўга да вёскі падыходжу да кіроўцы, і не шкадуючы чароўных ветлівых слоў, прашу зрабіць ласку, спыніцца... Кажу, што буду вельмі ўдзячнай... А ўбачыўшы, што словы мае пачуты, поўнай жменяй «сыплю» чалавеку пажаданняў — здароўя, дабра, шчаслівай дарогі сёння і заўсёды.

Кіроўцам крыху дзіўнавата чуць беларускую мову (дажыліся!). Але ж словы мае спрацоўваюць: я выходжу там, дзе бліжэй да дома. Аўтобус і яго пасажыры з добрым настроем едуць далей.

Я гэта да таго, наколькі важна быць уважлівымі і міласэрнымі адно да аднаго, наколькі добра было б жыць у краіне з «намоленым» паветрам.

А між іншым, чысціня яго залежыць не ад некага іншага... Толькі ад нас.

Ірына РУДКОЎСКАЯ,
в. Хатынічы, Ганцавіцкі раён.

■ Жывая зямля

ПТУШКІ ЯК ЛЮДЗІ

...Буслянка ўзвышалася над воданапорнай вежай, і туды перад кожным Дабравесцем прыляталі птушкі, што ўмомант рабілася першай навіной: «Прыляцелі... Буслы прыляцелі! Радасць якая! Вясна...». Пералётныя, між тым, кружылі над зямлёй — ладзілі сваё гняздо.

Так было гадамі, нават дзесяцігоддзямі. Аднак летась вежу... знеслі.

Пара буслоў доўга кружляла над вёскай — быццам паверыць не магла, што няма іх дома...

Але ж ёсць радзіма!

І птушкі пачалі з нуля. На радасць нам яны аблюбавалі тэлеграфны слуп непадалёк ад дома і ўзяліся за працу. Пацешна глядзець было, як цягнуць-падымаюць верхавіну зрэзанай вішні, як зносяць галінкі, сухую траву, як стараюцца паспець... Як урэшце на талаку да іх з «будматэрыяламі» ў дзюбках спяшаюцца вераб'і...

Буслы паспелі — пабудавалі свой дом, вывелі птушанят, але на гэтым іх беды не скончыліся. Аднойчы пад вечар над вёскай зашугала навальніца, пачалася страшная залева. Раніцой мы з жахам убачылі, што буслянка, у якую ўкладзена столькі працы, ляжыць на зямлі; трое ладных птушанят просяць дапамогі,

Мы зрабілі ўсё, што змаглі: на высокі навес зацягнулі ўсланае сенам кола ад легкавушкі, пасадзілі туды буслянят.

Увесь гэты час дарослыя птушкі з трывогай кружылі над разбураным гняздом, сачылі за нашай працай... Калі ж яна скончылася і каля новай буслянкі нікога не засталося, птушкі асмялелі і... прыляцелі да малых з першымі жабкамі і чарвякамі.

Вось так, нягледзячы ні на што, яны не здрадзілі радзіме, вось так гадавалі і выгадавалі сваіх дзяцей!

...Цяпер яны недзе далёка. Але ж, напэўна, збіраюцца дадому? Магчыма, каб зноў усё пачаць нанова...

Наталля САВІНА,
в. Аздзяцічы, Барысаўскі раён.

МУЗЫЧНЫЯ ВЕЧАРЫ НАД ПІНАЙ

Услед за Брэстам, дзе традыцыя фестывалю класічнай музыкі налічвае чвэрць стагоддзя, класічныя канцэрты некалькі гадоў ладзіць пінская музычная грамадскасць. Мерапрыемства атрымала назву «Лютаўскія музычныя вечары».

Гэтым разам «Вечары» адкрыліся канцэртам фартэпіяннай музыкі ў гарадскім Доме культуры (канцэртная зала, дзе звычайна праходзіла імпрэза, закрыта на рэстаўрацыю). Фэст адкрыў вядомы беларускі піяніст Ігар Алоўнікаў. У Пінску ў бліжэйшыя дні чакаюць акардэаністаў ансамбля «Фестываль», саліста Белдзяржфілармоніі Канстанціна Шарова з канцэртам арганнай музыкі. Запланаваны сумесны канцэрт гарадскіх духавога і камернага аркестраў.

Яна СВЕТАВА.

СЕННЕНСКАЙ ШКОЛЕ— 145 ГАДОЎ

Сёлетні год асаблівы для настаўнікаў і вучняў сенненскай сярэдняй школы №1: гэтай установе адукацыі споўнілася 145 гадоў. Гісторыя школы адлюстроўвае станаўленне і развіццё адукацыі не толькі ўсяго раёна, але і цяперашняй Віцебскай вобласці і Беларусі ў цэлым.

Паводле слоў Людмілы Крыштапенкі, кіраўніка гуртка «Вытокі» сярэдняй школы № 1 горада Сянно імя З.І. Азгура (народны мастак СССР нарадзіўся на Сенненшчыне), першыя, як цяпер кажуць, дзяржаўныя навучальныя агульнаадукацыйныя ўстановы ў заходніх губернях Расійскай імперыі адкрыліся пасля паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. У 1864 годзе ў Сянно стварылі прыходскае вучылішча, а праз год — павятовае. Але да канца XIX стагоддзя ў Сянно не было ні адной сярэдняй або прафесійнай адукацыйнай навучальнай установы.

І толькі ў 1867 годзе было створана вышэйшае пачатковае вучылішча. Цікава, што на навучанне, працягласць якога тады складала чатыры гады, прымаліся прадстаўнікі ўсіх саслоўяў. Вучылішча размяшчалася ў прыватных дамах. Сёння ў школе — каля 400 вучняў. Педагагічны калектыў — гэта больш як 50 настаўнікаў, у тым ліку 20 — з вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыяй. У гэтай навучальнай установе не могуць не ганарыцца тым, што за ўсе гады яе існавання яна ўваходзіла ў лік лепшых школ раёна.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Постаці

БЕЛАРУСКІ СУСАНІН ІВАН ЦУБА

Да пачатку 1943 года для барацьбы з партызанамі, аховы камунікацый, аэрадромаў і складоў нямецка-фашысцкія захопнікі вымушаны былі трымаць на тэрыторыі Піншчыны значныя сілы: 7-ю пяхотную дывізію, 73-і мінамётны полк, 43-ю стралковую дывізію, 256-ы батальён аховы, 3-ю кавалерыйскую брыгаду.

Партызаны Пінскай вобласці ўтрымлівалі і скоўвалі гэтую гітлераўскую армаду, не даючы захопнікам спакою.

У лютым 1943 года ў Старобінскім раёне, родных краях Васіля Захаравіча Каржа, падчас карнай блакады адбыліся і вось гэтыя трагічныя падзеі, звязаныя з «чарговымі» крывавымі «подзвігамі» сумна вядомага карнага батальёна штурмбанфюрара СС Оскара Дзірлівангера.

На Нюрнбергскім працэсе былы групенфюрар СС Эрых фон Бах-Залеўскі, адказваючы на пытанне савецкага абвінаваўцы І.В. Пакроўскага: «Чаму нямецкае камандаванне тылу павялічвала колькасць сваіх часцей за кошт злачынцаў?», заявіў: «На мой погляд, тут ёсць прамая сувязь з прамовай Генрыха Гімлера ў Вевельсбургу ў пачатку 1941 года, дзе ён казаў пра тое, што мэтай вайны з рускімі з'яўляецца расстрэл кожнага дзясятага са славянскага насельніцтва, каб паменшыць іх колькасць на 30 мільёнаў. Для вопыту і былі створаны такія нізкапробныя часці».

Такім чынам, Дзірлівангер выдатна падыходзіў для выканання задум Гімлера, прайшоўшы ў III рэйху «слаўны» шлях мацёрага крымінальніка...

У адным з загадаў Дзірлівангера напярэдадні правядзення чарговай крывавай акцыі ў Старобінскім раёне прама загадвалася: «Батальён яшчэ раз прачэсвае раён баявых дзеянняў... Пры гэтым павінна быць знішчана ўсё, што можа служыць абаронай і сховішчам. Вобласць павінна стаць «нікім не занятай прасторай». Мясцовае насельніцтва расстраляць, скаціну, збожжа і іншыя прадукты забраць...».

Падчас гэтай шматдзённай «экзэкуцыі» былі па-зверску знішчаны 9662 чалавекі. Як асаблівы поспех, групенфюрар СС фон Готберг адзначыў знішчэнне 3300 яўрэяў. Штурмбанфюрар СС Дзірлівангер атрымаў чарговую ўзнагароду. Так была ацэнена «вялікім гуманістам» Адольфам Гітлерам кроў беларускага народа...

Калі ў тым жа лютым 1943 года нацысты падчас карнай аперацыі «Хорнунг» кінулі супраць Пінскага і Слуцкага партызанскіх злучэнняў групоўку агульнай колькасцю амаль 20000 вайскоўцаў і акружылі партызанскую зону, Васіль Корж не завагаўся, не разгубіўся. Хоць паніка, якая пачалася ў абозе бежанцаў, што першым выводзілі з-пад удару партызаны, магла прывесці да такой бяды, што далей ратаваць проста не было б каго...

Памятаю, як былая партызанка Ада Цімафееўна Бандарэнка, з незвычайным хваляваннем распавядаючы мне пра гэтую блакаду, нібы зноўку перажывала той смяротна небяспечны люты 1943-га: «...Захаравіч перажываў за кожнага чалавека і дзейнічаў па прынцыпе «Рабі, што павінен, і будзе, што будзе!». Па-іншаму ён не мог! Памятаю, як частка абозу трапіла ў засаду, пад кулямётны агонь з дзота, і запанікавала. Ім здалося, што карнікі былі ўжо ўсюды. А Корж — увесь як сціснутая спружына. Ён адразу даў чаргу з аўтамата па-над галовамі і сваім звычным, камандзірскім голасам крыкнуў: «Стой! Хто толькі зрушыцца і пабяжыць назад, буду страляць! Дзот павінен быць знішчаны! Усім засяродзіцца і заняць абарону!».

Так мужныя і прафесійныя дзеянні Васіля Захаравіча Каржа тады, у крытычнай баявой сітуацыі, выручылі і выратавалі. Дзот быў знішчаны, карнікі адступілі, і калоне ўдалося прарваць акружэнне. Прымяняючы сваю каронную тактыку папераджальных нападаў, засад, налётаў, мініравання дарог, Корж здолеў збіць тэмп наступлення асноўных сіл акупантаў. Тым самым партызаны былі выведзены з акружэння, вытрымаўшы месячную аблогу карнікаў.

Аднак спачатку сілы былі няроўныя, і атрады з баямі адыходзілі ў глыб палескіх лясоў і балот. Разам з партызанамі сышлі і жыхары невялікай вёскі Навіны. А вось браты Міхаіл і Іван Цуба сысці не паспелі...

Ідучы напарадзе, Іван Цуба адводзіў эсэсаўцаў у бок ад урочышча Вербы, ад родных вёсак, завабліваючы іх у такую глухмень, куды і звер баяўся ў тыя часы заходзіць.

Сустрэўшы перад адыходам на ваколіцы вёскі свайго дзядзьку Івана Цубу, Васіль Захаравіч з трывогай спытаў:

— Вы яшчэ тут?! Чаму ў лес не сышлі разам з усімі?

— Ды я хачу забраць скаціну. Не пакідаць жа яе фашыстам. Я зараз вас наганю.

Не думаў тады Корж, што гэта былі апошнія словы свайка, якія яму давялося пачуць.

Адправіўшы сына і нявестку з дзецьмі ў лес да партызанаў, Іван Цуба выпусціў жывёлу з хлява і пагнаў яе ва ўрочышча Вербы. А грукат вінтовачных і аўтаматных стрэлаў набліжаўся. Неўзабаве на грачыновіцкай дарозе замігцелі цені салдат у шынялях мышынага колеру.

Стары паваліўся, прыціснуўся да мерзлых купін, заціх. Можа, пранясе? Але не, карнікі яго заўважылі, груба паднялі і пагналі назад у Навіну. Туды ж прывалаклі за ногі і хворага брата.

— Дзе партызаны, ты, свіння? — крычалі гітлераўцы.

— Хай вам ваўкі пакажуць дарогу да партызанаў, — прахрыпеў Міхаіл Цуба.

Бязлітасна разрадзіўшы свой пісталет у хворага і нямоглага старога, эсэсаўскі афіцэр тут жа накінуўся на Івана:

— Ты! Паказвай, куды пайшоў партызан? Не пакажаш — капут!

Перакладчык ледзь паспяваў перакладаць усе гэтыя пагрозы. І Іван Цуба павёў за сабой эсэсаўцаў. Напэўна, не ведалі нямецкія ваякі пра Івана Сусаніна і ганебны канец у далёкім 1612-м захопнікаў, якіх ён узяўся праводзіць.

Ідучы напарадзе, Іван Цуба адводзіў эсэсаўцаў у бок ад урочышча Вербы, ад родных вёсак, завабліваючы іх у такую глухмень, куды і звер баяўся ў тыя часы заходзіць. Па пояс у снезе яны адолелі дзесяць кіламетраў, мінулі балота і, нарэшце, спыніліся ля рачулкі Лань. Стары цяжка апусціўся на пень, прыкінуў, ці далёка цяпер партызаны Васіля Каржа і яго сваякі. Супакоіўшыся, насмешліва паглядзеў на спацелага на марозе афіцэра:

— Далей, шаноўныя, ісці вам няма куды... Толькі на той свет! Тут вы ўсе і перамерзнеце, з голаду перадохнеце або...

Дагаварыць ён не паспеў. Удар прыкладам па галаве аглушыў Івана Цубу, і ўжо не пачуў і не адчуў ён стрэлу ў патыліцу.

Настала ноч. Фашысты, якія захраслі ў балоце, з іх арыйскай педантычнасцю і прытрымліваннем «інструкцыі па барацьбе з ляснымі бандытамі» пачалі пускаць у неба сігнальныя ракеты, просячы дапамогі ў сваіх. Аднак першымі на гэтыя «прызыўныя» сігналы апаратыўна «адгукнуліся» партызаны-камароўцы. Яны выйшлі да ўрочышча і адправілі на той свет ворагаў усіх да аднаго.

Сваім подзвігам Іван Цуба выратаваў жыццё многім партызанам і мясцовым жыхарам. Ён адвёў карнікаў у бок ад таго шляху, па якім адыходзілі свае. Сляды тых, хто адступаў у лес, былі добра відаць, і эсэсаўцы лёгка маглі б іх нагнаць, калі б у іх у правадніках былі мясцовыя здраднікі. Бо партызаны адыходзілі павольна: з імі ішлі старыя, жанчыны, дзеці.

Подзвіг Івана Цубы ўзрушыў Пінскі партызанскі край. Здзейсніць яго мог толькі мужны чалавек, які вельмі любіў родную зямлю.

З падраздзялення карнікаў, якіх павёў за сабой Цуба, выратаваўся толькі перакладчык. І толькі таму, што адразу трапіў у рукі партызан-камароўцаў. Ён жа і распавёў пра апошнія гадзіны жыцця палешука Івана Цубы.

Пахавалі абодвух братоў, Івана і Міхаіла, у Хораставе. Доўга прастаяў Васіль Захаравіч каля магілы людзей, якіх ведаў і паважаў з дзяцінства і якім стаў абавязаны сваім жыццём. Дзядзьку Івану ў 1943 годзе было пад семдзесят гадоў, а Міхаіл размяняў ужо восьмы дзясятак. Працавітыя мужыкі, якія перанеслі на сваіх плячах усе нягоды нялёгкага сялянскага жыцця ў Заходняй Беларусі.

Памятаў Корж, як у 1940 годзе, пасля амаль дваццацігадовага расстання, прыехаў ён з Пінска ў родныя месцы. Дзядзька Іван, які сядзеў тады побач з ім за сталом, асцярожна дакрануўся рукой да двух ордэнаў за інтэрнацыянальную дапамогу ў Іспаніі, што красаваліся на яго грудзях, і захоплена паківаў галавой:

— І хто б падумаў, пляменнік, што ты вырасцеш і станеш заслужаным чалавекам. Быў малы хлопчык-паляшук, просты пастушок. І вось на табе — ордэны, пашана, слава! Парадаваў, парадаваў ты ўсіх нас. А то і не спадзяваліся пабачыцца...

Пашанай сёння карыстаецца і подзвіг самога Івана Цубы. Пасмяротна ён быў узнагароджаны ордэнам Леніна. А праз некалькі гадоў на скрыжаванні ажыўленых дарог непадалёк ад Салігорска заблішчаў бронзай помнік патрыётам зямлі беларускай — братам Івану і Міхаілу Цубам. Вёска Навіны перайменаваная ў іх гонар. Іх на зямлі роднай памятаюць.

Мікалай СМІРНОЎ

■

ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY

■ Кватэрнае пытанне

З КААПЕРАТЫВА ВЫКЛЮЧЫЦЬ МОГУЦЬ... КАЛІ...

У майго мужа з'явілася магчымасць памяняць працу. На новай абяцаюць большы заробак. Але ж на старой сфарміраваны ведамасны кааператыў, пачалося будаўніцтва дома з выкарыстаннем ільготнага крэдытавання. Пытанне: ці застаецца муж у складзе ЖБК, калі пяройдзе на працу ў іншую арганізацыю?

І. ГРЫШЭВІЧ, *г. Мінск.*

Калі работнік на законных падставах прыняты ў члены жыллёва-будаўнічага кааператыва, то выключаны з яго ён можа быць толькі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

Палажэннем аб арганізацыях забудоўшчыкаў (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2008 года № 43) вызначана (п. 21), што член арганізацыі забудоўшчыкаў можа быць выключаны з гэтай арганізацыі, у прыватнасці, у выпадках сістэматычнага неўнясення грашовых сродкаў для фінансавання будаўніцтва, рэканструкцыі, набыцця дома (калі фінансаванне ажыццяўляецца самастойна членам арганізацыі забудоўшчыкаў) або паявога (калі фінансаванне будаўніцтва, рэканструкцыі, набыцця дома ажыццяўляецца арганізацыяй забудоўшчыкаў) і іншых узносаў.

Сістэматычным неўнясненнем грашовых сродкаў для фінансавання будаўніцтва, рэканструкцыі, набыцця дома (калі фінансаванне ажыццяўляецца самастойна членам арганізацыі забудоўшчыкаў) або паявога (калі фінансаванне будаўніцтва, рэканструкцыі, набыцця дома ажыццяўляецца арганізацыяй забудоўшчыкаў) і іншых узносаў прызнаецца неўнясненне членам арганізацыі забудоўшчыкаў указаных сродкаў і ўзносаў у поўным аб'ёме на працягу двух перыядаў запар, вызначаных дагаворам на будаўніцтва, рэканструкцыю, набыццё дома, які прадугледжвае графік унясення плацяжоў (для грашовых сродкаў), або агульным сходам (для ўступнага, паявога і іншых узносаў).

Вышэйназванае палажэнне і іншыя нарматыўныя дакументы не змяшчаюць у якасці падставы для выключэння члена ЖБК з кааператыва яго звальненне або пераход на працу ў іншую арганізацыю.

Віктар САВІЦКІ.

■ Рэха

КАБ ЗАСТАЛАСЯ ПАМЯЦЬ...

5 снежня 1942 года партызанскай брыгадай Лявонава быў разгромлены нямецкі гарнізон у мястэчку Чарэя. Фашысты потым кожны наступны дзень бамбілі вёску, але вярнуць страчаныя пазіцыі так і не змаглі.

У памяць аб тых днях, аб гераізме партызан у сямідзясятыя гады ўжо мінулага стагоддзя на нашым сельскім Доме культуры ўстанавілі памятны знак...

А потым у Чарэі быў расфарміраваны сельскі Савет, ліквідаваны саўгас. У гэты ж час знікла з будынка і мемарыяльная дошка.

Нам, жыхарам вёскі, вельмі хацелася б, каб яе вярнулі, каб засталася памяць, але зрухаў у гэтай справе пакуль няма. Горш за тое, у хуткім часе можа не стаць і людзей, якія памятаюць пра вызваленне мястэчка, пра партызан, пра камандзіра танка маёра Папова, пахаванага ў нас, у брацкай магіле, пра камандзіра брыгады Лявонава...

Дык, мабыць, «Звязда» дапаможа нам узнавіць справядлівасць?

Па даручэнні вяскоўцаў

Рыгор ЯРАШКЕВІЧ,
в. Чарэя, Чашніцкі раён

■ Народная творчасць

ПА МОВУ...

...Ішлі яны берагам,
Лес дзе-нідзе...
І раптам сустрэў іх
дапытлівы дзед:
— Куды вы так, хлопцы?
Пяшком?.. Басанож?..
— Па мову, дзядуля.
— Па мову? Няўжо ж?
— Ды ў горадзе нешта
Яе не чуваць.
Дык родную пойдзем
па вёсках шукаць.
Ці ёсць яна ў Зблянах?
— Ды, кажуць, жыве,
бо хто ж ад народа
яе адарве?!
Яшчэ Панямонцы
гутóраць на ёй,
збіраючы ў лесе
грыбы за ракой.
— А Пескаўцы?..
Хочам і тамака быць.
— І ў Пескаўцах,
думаю, будзе шчэ жыць.
Гамоняць на ёй
Шаўдзіні і Шаршні,
Бурносы, Дакудава,
Орля, Гузні.
— Мы хочам дабрацца
яшчэ і туды,
бо родная мова
з крынічнай вады...
І хлопцы ўздоўж Нёмна
ідуць і пяюць.
А сосны ім водар
і сілы даюць.
Вітае гудзенне
пчалы ды чмяля,
і бусел крылом ім
махае здаля.
Задуму іх дуб
старажытны ўхваліў:
іх сэрцы агнём
векавым распаліў.
І дзяцел адобрыў
юначы імпэт.
А гэта ішлі
музыкант і паэт.
І хораша хлопцам
Пад небам было,
дзе ўсё наваколле
буяла, цвіло...
...У вёсках над Нёмнам
яны пабылі,
збіралі па слоўцы,
дзе толькі маглі:
на вуліцы, у хатах,
на лузе, у полі —
для мовы здабыць каб
найлепшае долі!

Уладзімір ВАСЬКО.
г. Ліда

■

Наш культурны асяродак

Жыроандоля

Выпуск № 6 (176)

ЧАС ШЧАМЯЛЁВА

Што хвалюе 90-гадовага мастака сёння

Выстава жывапісу і графікі Леаніда Шчамялёва «Мастак і час», прымеркаваная да 90-гадовага юбілею народнага мастака Беларусі, праходзіць у Нацыянальным мастацкім музеі да 5 сакавіка.

Фота БЕЛТА.

Каля 150 жывапісных і графічных твораў юбіляра (Леаніду Шчамялёву споўнілася 90 гадоў акурат днямі) апошніх гадоў прадстаўлена на выставе. Экспрэсіўныя і рэалістычныя людзі, кветкі, горад, эмоцыі Леаніда Шчамялёва заўжды прывабліваюць шчырасцю і прастатой. І нездарма, дарэчы, выстава мае назву «Мастак і час». Бо нарадзіўшыся ў Віцебску ў 1923 годзе, Леанід Дзмітрыевіч жыве сёння практычна ў іншым часе, у новым вымярэнні. Тая рэальнасць, калі ён толькі пачынаў, адрозніваецца ад сённяшняй самым кардынальным чынам. Хаця і не ва ўсім. І калі ранніе і ранейшыя творы Шчамялёва мы ўжо бачылі, то цяпер маем магчымасць падзівіцца на тое, што хвалюе мастака менавіта сёння. Паслухаць яго парады, пераняць яго жыццёвы і мастакоўскі вопыт.

Сам мастак гаворыць, што не хацеў рабіць рэтраспектыўную выставу. А хацеў менавіта падзяліцца сваімі нядаўнімі напрацоўкамі. Таму што як у пачатку творчага шляху зусім малады мастак можа пісаць карціны, якія «пацягнуць» на 70-гадовага аўтара, так і ў сталым веку можна пісаць абсалютна юнацкія карціны. У Леаніда Шчамялёва душа, напэўна, застанецца маладой заўсёды.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

■ Кніжная паліца

ЖЫВЫЯ

Словы, з якіх пачынаўся пісьменнік Васіль Быкаў

Ён іх пісаў... Не, усё-такі вымаўляў. Бо кожнае — гаворыць. Ён, бывала, з імі спрачаўся, мяняў, закрэсліваў. Яны пагаджаліся — каб было як мага лепш. Дакладней. Яны разумелі, што не маюць права вырывацца на паперу бескантрольна — таму што некаму належалі. Яны сядзелі глыбока, асэнсоўваліся, вызначалі сутнасць, а потым шукалі сваё месца. Ці ўсё ж такі гэта іх шукалі? Спрабавалі на смак? На гучанне? На сэнс?..

Вы адчуеце гэта. І нават убачыце, калі пагартаеце кнігу «Васіль Быкаў. Гарадзенскі архіў». Кніга пра тое, як пачынаўся пісьменнік. Не «з чаго», таму што, у прынцыпе, было вядома, якія былі яго першыя творы. А вось як яны ўзнікалі, менавіта паўставалі, нібыта моцны мур, які не цярпеў адступлення і пасавання, — вось тут найлепшым чынам можна зразумець. Можна ўбачыць, якім быў ранні Быкаў. Што ўжо тады было для яго прынцыпова. І што яго загартоўвала.

«Не ведаю, як хто, але я як пісьменнік спеў, на маю думку, даволі доўга і цяжка. Напісаўшы ў 1951 г. у часе свае службы на Далёкім Усходзе «Смерць чалавека» і «Абознік», я гадоў 5 не браўся за пяро пасля такой жа нясмелай, як і няўдалае, спробы надрукаваць іх у Беларусі. Мусіць, было рана, мусіць, тое, што жыло, бруілася ў душы, яшчэ не знайшло належнае літаратурнай формы, каб уздзейнічаць безадмоўна на чытача і, можа, перш за яго, — на рэдактара. Рэдакцыя «Полымя» вярнула мне гэтыя апавяданні з такім грунтоўным аналізам маіх хібаў, што я рашыў: не, узяўся не за сваю справу». У гэтым ён прызнаўся ў незавершанай аўтабіяграфіі. Прызнаўся, як пазбаўляўся сумненняў, як успрымаў крытыку, калі яго творы «забракоўвалі», якія людзі абнадзеілі і далі падтрымку, каб пісаць далей. Як ішоў ад апавяданняў да аповесцяў. Але і як пасля першых публікацый у літаратурных часопісах і станоўчых рэцэнзій падрыхтаваныя да выдання зборнікі здымалі, знайшоўшы ў іх безліч «ідэйных» хібаў. Але кніжкі ўсё роўна прыходзілі да людзей. Незавершаная аўтарам аўтабіяграфія, якая аказалася ў «Гарадзенскім архіве», дазваляе адчуць не столькі класіка, які распавядае пра тое, як ён ішоў у літаратуру, колькі чалавека, які ішоў да сябе: «Перш за ўсё я зразумеў, што ў літаратуры трэба ісці сваёй дарогай, толькі тая праўда, якую іспаведаеш сам, можа быць праўдай і для людзей, што ўзятыя напракат хадзячыя ісціны часцей за ўсё пусты гук, фальшыўкі, што падзеі, не прапушчаныя праз уласную душу, не здольны пераконваць нікога, а эмоцыі, калі яны выдуманы, — меладраматычныя. Не болей».

У зборніку сабрана тое, што было знойдзена ў Гродне, што захоўвалася ў кватэры, дзе жыў з 1972 года разам з сям'ёй Васіль Быкаў. Гэты архіў захаваўся дзякуючы сынам пісьменніка, якія перадалі чамадан з аркушамі, дзе было нешта напісана ці надрукавана яго рукамі — на вывучэнне. Для гісторыі. І калі разгортваеш кнігу з думкамі, што гісторыя — гэта тое, што было, то загортваеш з упэўненасцю ў тым, што гісторыя заўсёды мае працяг.

Творы Быкава — гэта адчуванне руху. Творы Быкава ў руху (калі бачыш, як яны складаліся) — гэта яшчэ і прыстасаванне для кантакту з чалавекам, які жывы. Абсалютна жывы! Яго дух, ідэя, думка пульсуе, стукаецца літарамі на паперу, а потым — і ў тваю галаву. У архіве, аказалася, ёсць творы невядомыя, якія не друкаваліся. Ёсць накіды. Цікавыя распрацоўкі сюжэтаў. Нататкі.



Фрагмент аповядання «Жалезны камандзір»

Накіды да аповядання «Жалезны камандзір»

У аповесці «Атака», якая напісана прыкладна ў 1961-1962 гадах, будзе цікава сустрэцца, напрыклад, з героямі, якіх мы ведаем па аповесці «Мёртвым не баліць», што была напісана пазней. Праўкі ў машынапісе зроблены пяром з сінімі чарнілакі «Узыходжанне» выйшаў у 1977 годзе і было ў ім тое быкаўскае, што сказана паміж радкоў...



Але нават паміж радкоў яно рабіла сваю справу. Таму што адчувалася і біла адразу ў цэль. У гэтым сэнсе паказальная аповесць «Апошні баец», якая была надрукавана ў газеце «Чырвоная змена» ў 1958 годзе. Дзеля публікацыі аўтар сам скараціў сваю аповесць на старонак 30, але быў незадаволены тым, што выйшла, і называў яе «выдуманай», а «пра вайну выдумваць нельга»... У зборніку аповесць друкуецца ў перакладзе на рускую мову М. Гарбачова (які нідзе так і не быў надрукаваны). Але адметна, што вылучаныя месцы, якія былі скарочаны ў газетнай публікацыі. Вельмі цікава паглядзець, што ж лічылася тады вартым скарачэння? Часам сапраўды скарачэнні рабіліся дзеля дынамікі ў развіцці сюжэта (усё-такі газета), а часам «рэзаліся» кавалкі лірычныя ці тыя, якія менавіта і стваралі той самы славуты быкаўскі псіхалагізм (і не верыцца, што гэтыя скарачэнні рабіў ён сам). Ці, можа, былі і іншыя рэдактарскія прычыны, каб выкрэсліваць сказы, абзацы і нават кавалкі. Вось такія, напрыклад: «Но не так легко было остановить охваченных ужасом людей, которые теперь единственное спасение видели только в собственных ногах». Ці: «Парню казалось, что несчастье их полка — позор в этой войне и что именно он несет своим войскам самую страшную весть».

Але пра тое, як выспяваў пісьменнік, распавядаюць не толькі гатовыя творы. Часам маленькія нататачкі, ідэі, пазначаныя на аркушах паперы, могуць быць вельмі красамоўнымі. І калі ўтаймавалася трымценне ад таго, што гэта рукой Быкава (!) занатаваныя ідэі Быкава (!), то разумееш, што перад табой — жывы ўрок пісьменніка Быкава (!), дадзены пісьменнікам-пачаткоўцам. Такім быкаўскім урокам я назвала б раздзел «Нататнікі» — ён адсоўвае заслону часу, якая аддзяляе нас ад таго, як і з чаго складаліся творы, як вялася распрацоўка сюжэтаў і вобразаў. А то і асобныя ўдалыя сказы запісваліся, каб не згубіць іх потым. Вось адзін з такіх: «Сланечнік цягнецца за сонцам. Сімвал прыстасаванца». Цудоўны вобраз. Мастацкі. А галоўнае — пазачасавы. І можна сюды больш нічога не дадаваць. Асобны маленькі твор.

Цікава, што, акрамя аповесцяў (планы якіх ёсць у нататніках), была яшчэ і задума рамана «Акружэнне» і нават распрацаваны 3 варыянты сюжэта для яго. Усё-такі ў яго была свая тэма ў літаратуры. І нават у тых, што заставаліся ненадрукаванымі, бачны толькі яго, «быкаўскі» погляд, які грунтаваўся на дэталях, дакладнасці, нюансах, якімі ўважлівы чалавек і дакладны пісьменнік не будзе грэбаваць. Гэты раздзел (няхай і не маштабны) дае магчымасць адчуць маштаб асобы пісьменніка. Таму што часам і аднаго сказа ці абзаца дастаткова для таго, каб адчувалася глыбіня думкі. Вось адна маленькая нататачка «Званы»: «Як у 33 г. прыехаў трактар і сцягвалі з царквы званы. Мястэчка засталося без языка. Анямела. Рэакцыя людзей». Усё астатняе можна дадумаць, дадаць, сфармуляваць, адолеўшы анямеласць. Кожны здольны на гэта. А Быкаў унікальны менавіта таму, што заўсёды ў сваіх творах даваў такую магчымасць. Ён нібыта казаў усё сам, называў рэчы і з'явы сваімі імёнамі, але прымаючы яго словы, чытач іх вымаўляў у сваёй душы, а потым прамаўляў праз учынкі. Калісьці нас вучылі чытаць Быкава менавіта так. Таму што ён умеў рабіць словы жывымі.

Ларыса ЦІМОШЫК

ДНІ ДЛЯ АБМЕНУ

Плач Яраслаўны з Беларусі пачуюць у Эстоніі

Падчас Дзён культуры, якія на гэтым тыдні пачаліся ў прыбалтыйскай краіне. Да іх прымеркаваны і першыя ў гісторыі гастролі Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі ў гэтай краіне. Акрамя таго, пакажам нешта і чыста беларускае — фальклор (ад ансамбля «Купалінка»), фотавыставу, якая дэманструе помнікі гісторыі і вуліцы Мінска (з калекцыі Музея сучаснага выяўленчага мастацтва).

Адначасова ў гэтыя дні трупу нацыянальнай оперы «Эстонія» вітаюць у нас — тэатры памяняліся сцэнамі на некалькі вечароў. Ад нас у Талін паехалі «Спартак», «Тамар», «Шахеразада», «Князь Ігар» і «Мадам Батэрфляй». Адкрыліся гастролі балетам Арама Хачатурана «Спартак», які быў пастаўлены Валянцінам Елізар'евым яшчэ ў 1980 годзе, але і дагэтуль з'яўляецца адным з тых спектакляў, якія і самім варта паглядзець, і іншым паказаць. Яго і паказваюць вельмі актыўна — спектакль цудоўна прымаюць гледачы розных краін. На сцэне оперы «Эстонія» танцавалі галоўныя партыі Антон Краўчанка(Спартак), Канстанцін Кузняцоў (Крас), Ірына Яромкіна (Фрыгія). Лепшыя беларускія балетныя сілы ў Эстоніі паказуць сябе ў двух аднаактовых балетах, якія маюць дачыненне да гісторыі харэаграфічнага мастацтва XX стагоддзя, калі ў Еўропе праходзілі на вышэйшым узроўні «Рускія сезоны». Цяпер у ім цудоўна выступаюць беларускія танцоўшчыцы, напрыклад, у Эстонію паехалі Вольга Гайко і Людміла Кудраўцава. У беларускім тэатры балеты «Тамар» і «Шахеразада» паставіў Андрыс Ліепа.

Балет для нас — адно з самых важных мастацтваў. Але гэта не ўсё, што тэатр гатовы паказваць за межамі. Напрыклад, оперу Барадзіна «Князь Ігар», нядаўна адноўленую Юрыем Аляксандравым: а то, можа, у Эстоніі цяпер ужо забыліся пра «Слова пра паход Ігаравы»? Але пра «Мадам Батэрфляй» Пучыні, відаць, нагадваць не трэба: спектакль будзе паказаны два разы. Прыкметна, што падчас эстонскіх гастроляў у партыі Чыа-Чыа-сан павінна дэбютаваць лаўрэат міжнародных конкурсаў Таццяна Гаўрылава. Дырыжыраваць будзе Андрэй Галанаў.

Гэта першыя абменныя гастролі двух тэатраў. І каб паказаць сябе ў найлепшым выглядзе, ад нашага тэатра ў Эстонію паехала больш за 200 артыстаў (разам з аркестрам). У Днях культуры Беларусі бярэ ўдзел больш за 300 чалавек. Маштабна, аднак...

Ларыса ЦІМОШЫК.

Персанальная рэальнасць Уладзіміра Цэслера

Усе залы Музея сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску аддалі пад выставу беларускага дызайнера

А на самім адкрыцці выставы «Практыка рынкавага рэалізму» мастацтвазнаўца Таццяна Бембель прапанавала ў адной з залаў музея зрабіць творы Цэслера часткай пастаяннай экспазіцыі.

— Тады, — пераканана мастацтвазнаўца, — практыку рынкавага рэалізму гэты музей асвоіў бы на ўсе сто працэнтаў.

І гэта сапраўды так. Бо людзей на адкрыцці выставы сабралася столькі, што музей нават не змог змясціць усіх ахвотных. Агульную колькасць наведвальнікаў экспазіцыі, якая будзе працаваць да 2 сакавіка, нават цяжка ўявіць.

І не захапляцца творамі Цэслера, ды і самім творцам, сапраўды немагчыма. Ён стварыў сваю рэальнасць. Я нават сказала бы — гіперрэальнасць. Дзе ўсё жыве па сваіх правілах і законах. Дзе погляд на куміраў і трэнды, брэнды і нацыянальныя асаблівасці вельмі адрозніваецца ад агульнапрынятага. Нягледзячы нават на тое, што і самога Цэслера ўжо даўно называюць беларускім брэндам. І ў мінулым годзе ўручылі яму найвышэйшую ўзнагароду Міністэрства культуры — знак «За ўклад у развіццё беларускай культуры». Вядома, прыемна. Але не думаю, што для Цэслера ўзнагароды наогул маюць нейкае сакральнае значэнне. Ён нібы сам па сабе.

— Яшчэ калі мы з Вовам вучыліся ў тэатральна-мастацкім інстытуце, вакол яго ўжо была процьма народу! — распавядае **Рыгор СІТНІЦА, намеснік старшыні Саюза беларускіх мастакоў**. — Шмат каму даецца талент і здольнасці прафесійныя, мастакоўскія. Але мала каму даецца талент іроніі і самаіроніі. Самаіронія — гэта найвялікшы чалавечы і мастацкі талент. Мала хто ў Беларусі ім валодае. А Валодзя Цэслер валодае дасканала.

Акрамя ўсяго пералічанага, яшчэ адзін талент, якім адназначна валодае Цэслер, — гэта сціпласць і прастата. І, дарэчы, чым далей, тым больш пераконваюся, што адсутнасць прастаты ў чалавека пры наяўнасці розных званняў-узнагарод-рэгалій сведчыць пра яго камунікатыўную неадэкватнасць. Словам, чым больш чалавек па-сапраўднаму разумны і паспяховы, тым больш ён просты. Цэслер такі.

— Гэтая выстава — у прынцыпе, гэта нічога асаблівага, — **распавядае дызайнер.** — Проста ў мяне такога яшчэ не было, каб столькі розных работ былі сабраны ў адным месцы. Тут шмат прац, якія мы рабілі яшчэ з Сяргеем Войчанкам, якога ўжо няма з намі... Многія я зрабіў адзін.

Не ўдаючыся ў псеўдакультуралагічныя тлумачэнні, адчуваючы салодкую непазбежнасць фуршэту, Цэслер сціпла рэзюмаваў:

— Адным словам, дзякуй, што прыйшлі. Ну, і не буду доўга гаварыць, а то там ужо ежай запахла.

ДЗЕЦІ ЯК АРТ-АБ'ЕКТ

Назву «Практыка рынкавага рэалізму» для выставы прапанаваў сам дызайнер. Тут мы можам пабачыць жывапіс, скульптуру, арт-аб'екты. Усе яны маюць нейкую сваю разыначку. Або мандарыначку. Як, напрыклад, арт-аб'ект «Часнок», які замест аднаго зубчыка часнаку мае дольку мандарына. Абсурд — улюбёная цэслераўская фішка. Смеласць — тая якасць, якая дапамагае яму заразіць сваім абсурдам усіх навакольных. Зацягнуць іх у сваю рэальнасць. У рэшце рэшт, прадаць гэты абсурд, зрабіць папулярным.

— Мы жывём у сістэме рынкавай эканомікі, адпаведна, усё мастацтва, як бы нам ні хацелася, падпарадкоўваецца гэтай сістэме, — мяркуе Уладзімір Цэслер. — Любы мастак, які гаворыць, што ён не камерцыйны, — хлусіць, бо тым самым ён імкнецца даражэй сябе прадаць. Адпаведна, усе мы ў жыцці таргуемся. Хто ў меншай, хто ў большай ступені. Але гэта не перашкаджае гледачам захапляцца мастацтвам, калі мы, мастакі, робім тое, што хочам і калі нам гэта ўдаецца.

Дызайнер, якому ўжо за 60, з лёгкасцю эпаціруе публіку, апранае мікеланджалаўскага Давіда ў касцюм супермена і збірае натоўп 20-гадовых фанатаў і фанатак. Гэта сведчыць пра тое, што ў свеце сучаснага мастацтва Уладзімір Цэслер — гулец упэўнены. Ведае ўсе трукі і ўлоўкі, якія дапамаглі яму засвоіць практыку рынкавага рэалізму ў абсалюце.

І хаця новых твораў Цэслера на выставе не так ужо і шмат, ёсць адзін, які таксама толькі адносна можна назваць новым, бо яму ўжо сёмы гадок ідзе, але экспануецца ён упершыню. Подпіс гучыць наступным чынам: «Уладзімір Цэслер. Сын Яша. 2006 год стварэння». Гэта, вядома, у разбэшчаным свеце актуальнага мастацтва выглядае не так ужо і арыгінальна. Але на сына Цэслера цікава было паглядзець усім. Не думаю, праўда, што ён будзе арт-аб'ектам увесь час працы экспазіцыі.

— Ну, мне тата сказаў: «Паўгадзінкі пасядзі», — **расказвае малы,** седзячы на вялікім белым кубе ў акружэнні фатографаў і гуляючыся ў «Сімпсанаў» на мабільным тэлефоне. Выседзець малому, зразумела, прыйшлося нашмат больш. Але, як вядома, мастацтва патрабуе ахвяр.

Такім чынам, беларускі дызайнер сцёр усе межы, разбурыў забабоны і прымхі і нібы сказаў усім нам: у свеце, дзе надта папулярным стаў рух «child-free» («без дзяцей»), дзеці якраз і з'яўляюцца самым галоўным творам і мастацтва, і жыцця наогул. А ўжо Уладзімір Цэслер, якому, калі нарадзіўся Яша, было 55 гадоў, ведае ў гэтым толк.

КУЛЬТ АСОБЫ

Між іншым, прадстаўнікі Мінкульта і Мінгарвыканкама, якія прысутнічалі на адкрыцці выставы, цалкам падтрымалі ідэю зрабіць у адной з залаў музея пастаянную экспазіцыю твораў Цэслера. Так што ўсё можа быць. Я прапанавала б такую — «Школьны кабінет». Гэта не проста арт-аб'ект, як звычайна бывае ў Цэслера, а паўнавартасная інсталяцыя, упісаная ў асяродак. Дошка, крэйда, глобус, школьныя парты і крэслы. Ну, і безумоўна, партрэты на сценах. Па старой добрай традыцыі ў школах так прынята: вешаць партрэты знакамітых людзей розных відаў дзейнасці (чытай: куміраў) на сцяну. Але свет мяняецца, куміры таксама не застаюцца нязменнымі. Сённяшнім дзецям ужо не так цікава глядзець на Лермантава ў кабінеце рускай літаратуры або на Якуба Коласа — у кабінеце беларускай. Дзяцей, ды і дарослых людзей, таксама апанаваў культ рэчаў. Ім патрэбны мабільныя тэлефоны і электронныя кнігі, яны ведаюць усё пра іх найноўшыя мадэлі і ўдасканаленні. Але ім ужо не так важна, КАМУ патэлефанаваць ці ШТО прачытаць. Уладзімір Цэслер прапаноўвае не быць занудамі і не займацца маралізатарствам, а калі ўжо дзецям падабаюцца найноўшыя тэхналогіі, грошы ды іншыя выгоды сучаснай цывілізацыі, то і партрэты на школьныя сцены павесіць ім адпаведныя: Маўродзі, Памэла Андэрсан, Сяргей Шнураў, Раман Абрамовіч, Сільвестар Сталонэ ды іншыя. Гэта ўсё героі дзяцей, якія выраслі ў 1990-х і 2000-х, ужо трошку выпрабаваныя часам і «заслугоўваюць» таго, каб стаць прыкладам для пераймання і аб'ектам для вывучэння.

Дызайнер, якому ўжо за 60, з лёгкасцю эпаціруе публіку, апранае мікеланджалаўскага Давіда ў касцюм супермена і збірае натоўп 20-гадовых фанатаў і фанатак.

2009. Год быка .

Але і тут Цэслер не абышоўся без іроніі. Вы толькі ўдумайцеся! Хто ўсе гэтыя людзі? Што дапамагло ім стаць знакамітымі? За што іх любяць і чаму хочуць быць такімі, як яны? Калі вы правільна адкажаце сабе на гэтыя пытанні, то зразумееце, што «Школьны кабінет» — гэта не толькі іранічны, але і глыбока трагічны праект. Груба кажучы, скажы мне, што вісіць у цябе на сценах, і я скажу — хто ты.

Чорна-белыя, выкананыя алоўкам у рэалістычнай манеры, у мінімалістычных рамках з лаканічнымі подпісамі новыя партрэты для школ ад Уладзіміра Цэслера — гэта трагедыя нашага часу. Калі паэты, мастакі, навукоўцы ды іншыя светлыя галовы чалавецтва ўжо нікому не патрэбны. І калі сучасныя школьнікі мараць не пра тое, каб стаць паэтам (таму што гэта, ну гэта немагчыма апісаць словамі!), а прадпрымальнікамі, мадэлямі, актрысамі ды іншымі алігархамі і дырэктарамі нафтавых вышак... Без лішняга ментарства Цэслер сказаў нам праўду, пра якую мы і самі, у прынцыпе, здагадваліся. Але якую баяліся агучыць.

ВЕСЯЛУХА Ў ДРАНІКЛЭНДЗЕ

Некалі даўно Уладзімір Цэслер сказаў мне пра выставы сапраўдным афарызмам. Маўляў, выставы ён рабіць не любіць, таму што ад іх мала толку, а з-за іх надта шмат клопату. І, наогул, выставы — гэта сапраўдны галаўны боль для мастака. Шчыра кажучы, нават уявіць страшна, якім глабальным галаўным болем стала для мастака вось гэтая выстава, бо яна сапраўды велізарная, рэтраспектыўная.

Фота БЕЛТА.

Акрамя ўсяго, тут можна пабачыць, напрыклад, і знакамітыя цэслераўскія яйкі. Гэта «Праект стагоддзя: Дваццаць з ХХ», у якім дызайнер увасобіў на свой суб'ектыўны погляд 20 найвялікшых людзей ХХ стагоддзя ў выглядзе яек. Яйка Уладзіміра Маякоўскага з грубага ржавага металу, чорнае яйка Казіміра Малевіча, празрыстае шкляное яйка Іосіфа Бродскага ды інш. Вось толькі ні ў «Школьным кабінеце», ні ў вобразе яйка не ўвасоблены ніводны беларускі герой. І ў гэтым адчуваецца ўся цэслераўская суровасць і патрабавальнасць. Значыць, яшчэ не дараслі? Ці што?..

Затое ёсць дасціпныя цішоткі з іранічнымі надпісамі «DranikLand», «CHINEL» і «Merry Crisis!». Ёсць серыя стылізаваных пад лубок маляваных на лёне дыванкоў — «Галівудскія весялухі». Ёсць лаканічная серыя опарт-аб'ектаў «Вектарныя тэхналогіі», якую неспрактыкаваны глядач можа прыняць за павялічаныя рэбусы а-ля «Магічнае вока».

Цэслер катэгарычны і безапеляцыйны. Яго свет — паралельная рэальнасць, яго творы — загадка для розуму. Думаю, прыйдзе час і стануць выдаваць не толькі альбомы яго твораў, але біяграфію і даследаванні яго творчасці.

Таму што дызайнер Уладзімір Цэслер — сапраўды легендарная асоба. Мы нават самі не заўважаем, што, можа быць, сутыкаемся з ім бадай кожны дзень. Зрэдку, калі разглядаем рэкламу ў метро (таму што якаснай рэкламы ў нас надзвычай мала і заказчыкі, як правіла, эканомяць на дызайне, але часам сярод найлепшых можна пабачыць і рэкламу ад Цэслера). Часам, калі ідзём у кавярню або рэстаран, таму што Цэслер рабіў лагатыпы для многіх сталічных (і не толькі) устаноў, кампаній, фірмаў. І нават калі глядзім тэлебачанне. Павандраваўшы па персанальным сайце дызайнера, я высветліла, што, напрыклад, стары лагатып беларускага тэлебачання — БТ — быў створаны якраз на «Артдызайнстудыі Цэслер & Войчанка». Ды і лагатыпы некаторых іншых беларускіх СМІ таксама зрабілі тут.

Беларуская рэальнасць была б куды прывабней, калі б у ёй было больш такіх куміраў, як Цэслер, больш патрабавальнасці і трошку больш самаіроніі.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ

■ Прыцягненне на практыцы

БУДУЦЬ ГРОШЫ — ПРЫЯЗДЖАЙЦЕ!

З інвестыцыйных праектаў вырастаюць даходныя прадпрыемствы. Магілёўская вобласць хоча сёлета прыцягнуць у эканоміку 200 мільёнаў долараў прамых замежных інвестыцый.

«ДРАЎНІННЫ» БІЗНЭС

— У гэтым годзе ў нас з'явілися новыя інвестыцыйныя праекты, буйныя і значныя для нашага рэгіёна, — кажа **намеснік старшыні камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама Дзмітрый НЕМЯНКОЎ.** — Напрыклад, на нас звярнула ўвагу аўстрыйская кампанія «Кронаспан», якая цяпер разам з абласной уладай і адміністрацыяй свабоднай эканамічнай зоны «Магілёў» працуе над рэалізацыяй інвестыцыйнага праекта па вытворчасці матэрыялаў для мэблевай і будаўнічай прамысловасці. На новым прадпрыемстве будзе вырабляцца драўнінная пліта. Кампанія заявіла інвестыцыі на суму 100 мільёнаў еўра — гэта будзе капітал з Кіпра.

Новае прадпрыемства з'явіцца на адным з участкаў свабоднай эканамічнай зоны, дзе паспяхова развіваюцца ўжо некалькі праектаў, аб'яднаных у адзіны лясны кластар. Адзін з іх — вядомы на ўсю краіну, які жыццяёўляе замежнае таварыства **«ВМГ Індустры»**. Літоўцы будуюць у Магілёве дрэваапрацоўчы комплекс, які фактычна складаецца з трох заводаў. Акрамя вытворчасці драўніннай пліты, тут будзе вырабляцца мэбля гандлёвай маркі «IKEA». Сёлета запрацуе першы пускавы комплекс. У бліжэйшы час ён будзе афіцыйна адкрыты — у Магілёве з гэтай нагоды чакаюць высокіх гасцей.

Сёння сайт замежнага таварыства з абмежаванай адказнасцю стракацее аб'явамі вакансій. Пасля рэалізацыі гэтага праекта на комплексе будзе створана больш за 800 працоўных месцаў.

«ГАРАДСКІЯ» ІНВЕСТАРЫ

Яшчэ адзін буйны інвестыцыйны праект на сёлета — **прадпрыемства па вырабе тэхнічнага вугляроду.** Расіяне заснавалі замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «ОмскКарбонМагілёў». Плануецца, што інвестыцыі складуць каля 100 мільёнаў еўра. Прадукцыя гэтага прадпрыемства, неабходная для вырабу шын, будзе ісці не толькі на экспарт, але і на ўнутраны рынак. Асноўным беларускім спажыўцом тэхнічнага вугляроду, паводле планаў, стане адкрытае акцыянернае таварыства «Белшына».

«Крычаўцэменташыфер» плануе сёлета ўвесці новую тэхналагічную лінію па вытворчасці цэменту. Гэта буйны інвестыцыйны праект: у раённым цэнтры ўзводзіцца практычна новае сучаснае прадпрыемства. Праект увасабляецца ў жыццё з выкарыстаннем кітайскіх крэдытных рэсурсаў. Лінія забяспечыць магутнасць завода ў 1,8 млн тон цэменту ў год.

Таксама ў Крычаве яшчэ летась пачалася праца па арганізацыі вытворчасці цэмента-стружачнай пліты. Інвестыцыйны праект ажыццяўляе **таварыства «Белзамежбуд»**. Пры будаўніцтве жылля гэтыя пліты будуць выкарыстоўвацца для абліцоўкі. Мяркуецца, што такая прадукцыя дазволіць у выніку паменшыць кошт квадратнага метра новага жылля.

У Магілёўскай вобласці працягваецца развіццё сур'ёзных інвестыцыйных праектаў з замежным капіталам. Напрыклад, на **Асіповіцкім вагонабудаўнічым заводзе** ідзе арганізацыя вытворчасці і рамонту грузавога чыгуначнага транспарту. Размова ідзе пра танк-кантэйнеры для перавозкі вадкасцяў і сыпучых матэрыялаў. Свае грошы ў рэалізацыю праекта выдаткоўвае расійскі інвестар. Праектная магутнасць вытворчасці павінна скласці больш за 300 мільёнаў долараў за год.

ВЫСОКАЕ НАПРУЖАННЕ

Увогуле ж паказчык па прыцягненні ў вобласць прамых замежных інвестыцый у Магілёўскім аблвыканкаме ацэньваюць як напружаны. Лічба ў 145 млн долараў у некалькі разоў перавышае леташні ўзровень. Аднак на апошнім пасяджэнні Магілёўскага аблвыканкама пры абмеркаванні перспектыў развіцця на гэты год **кіраўнік вобласці Пётр РУДНІК** паставіў задачу: падняць планку — да 200 мільёнаў долараў.

Старшыня аблвыканкама нагадаў, што ў раёнах трэба ствараць новыя сучасныя канкурэнтаздольныя вытворчасці і выдаткаваць немалыя сродкі ў мадэрнізацыю дзеючых прадпрыемстваў.

— Для гэтага вельмі важна прыцягнуць капітал звонку, — сказаў Пётр Руднік. — У той жа час мы павінны не забывацца тут аб дзяржаўным падыходзе — развіцці канкрэтнай тэрыторыі і сацыяльных гарантыях людзям.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама лічыць, што за працу па прасоўванні і ажыццяўленні інвестыцыйных праектаў трэба браць кіраўнікам гарадоў і раёнаў з каардынацыяй гэтай працы з боку камітэта эканомікі. Губернатар запатрабаваў арганізаваць гэтую працу на высокім прафесійным узроўні.

СЕЛЬСКІЯ РЭСУРСЫ

Партфель інвестыцыйных праектаў для выканання задач сфарміраваны, каментуюць у камітэце эканомікі. Аднак калі рэальна глядзець на рэчы, то канчаткова ўсё залежыць не толькі ад высілкаў улады, але і ад намераў саміх інвестараў, якія прымаюць рашэнні ў залежнасці ад уласных інтарэсаў і эканамічнай сітуацыі.

— Таму мы не абмяжоўваемся складзеным пералікам праектаў і працуем з інвестыцыйнымі прапановамі, якія ёсць у кожным сельскім раёне і розных галінах эканомікі, — расказаў Дзмітрый Немянкоў. — Для іх мы шукаем інвестараў, прычым не толькі ў замежжы, але і ў Беларусі.

Перспектыўныя прапановы па мадэрнізацыі вытворчасці ёсць у «Белшыны», па тэхнічным абсталяванні — у прадпрыемстваў «Бабруйскаграмаш» і «Бабруйсксельмаш». У Бабруйскім раёне вызначана пляцоўка для лагістычнага цэнтра — пад новы праект патрабуецца інвестар.

Чавускі завод жалезабетонных вырабаў прапануе зрабіць рэканструкцыю вытворчасці. У тых жа Чавусах актуальнай з'яўляецца арганізацыя вытворчасці па вырабе цэглы: калі казаць пра запасы гліны ў рэгіёне, то менавіта Чавускі раён тут выглядае найбольш прыцягальным.

Увогуле шмат інвестыцыйных прапаноў заснаваны на мясцовых прыродных рэсурсах. Напрыклад, у Клічаўскім раёне прапануюць разліваць мінеральную і пітную ваду. У Хоцімскім раёне з дапамогай айчыннага інвестара пачалі распрацоўваць самае багатае ў краіне радовішча трэпелу: гэты мінерал мяркуецца здабываць і выкарыстоўваць для вытворчасці кармоў. У Асіповічы прыйшоў беларускі інвестар на распрацоўку тарфяных залежаў для вытворчасці паліўных брыкетаў. Хто наступны?..

Ілона ІВАНОВА

■

ИЗВЕЩЕНИЕ
